

ПАЧЫМ ЗІЗІФУС І БРУЖМЕЛЬ ДЛЯ БЕЛАРУСАЎ? 5

ПРЫЙШЛА ЭПОХА АРАМНАВА 13



Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

8 КАСТРЫЧНІКА 2019 г. АЎТОРАК № 191 (29058)

## ЦЫТАТА ДНЯ



**Віктар КАРАНКЕВІЧ, міністр энергетыкі:**

*«Будаўніцтва БелАЭС дало імпульс па развіцці новых вытворчасцяў у краіне, у тым ліку энергаёмістых. Таксама створаны ўмовы па пашырэнні сферы і вобласці прымянення электрычнай энергіі ў краіне. Возьмем, напрыклад, развіццё электратранспарту. У Мінску ўжо перавозяць пасажыраў сучасныя электробусы беларускай вытворчасці ўзамен традыцыйных аўтобусаў, якія працуюць на вуглевадародным паліве. Электрыфікуюцца ўчасткі чыгункі, актыўна развіваецца зарадная інфраструктура для аўтамабільнага транспарту. Развіваецца і будаўніцтва новых жылых дамоў з прымяненнем электраацяпляльнага абсталявання, якое замяняе традыцыйныя схемы цеплазабеспячэння ад кацельняў і ЦЭЦ, якія працуюць на вуглевадародным паліве».*




# Дэфіле ля крыніцы



Маленькі сучасны горад Дзісна, які бярэ свой пачатак у Сярэднявеччы, месціцца на берагах адразу дзвюх рэк — Дзвіны і Дзісны. Спрадвеку тут працавалі арцелі, квітнела рамяство, сярод майстравых людзей шчыравалі і ганчары. Іхнія вырабы і дагэтуль захоўваюцца ў ашчадных гаспадароў і на музейных паліцах. Уздоўж рачных берагоў струменяць шматлікія крыніцы. Адзін з такіх вытокаў знаходзіцца на левым дзісенскім беразе. Над вытокам збудаваны драўляны шацёр, вада збіраецца ў цэментны калодзеж круглай формы — сюды вядзе вузкая, але выбітая сцяжына. Ужо не адно стагоддзе дзісенцы ходзяць па сцежцы «ў крыніцу» — так спрадвеку называюць гэтае месца, каб зачэрпнуць чыстай, халоднай, смачнай вады. Выток хоць і не з'яўляецца афіцыйным помнікам прыроды, але, насамрэч, такі ён і ёсць.

Вяртаннем да сваіх спрадвечных вытокаў у Дзісне стала і праца мясцовага Цэнтра рамёстваў па адраджэнні жаночых строяў. Майстры-рукадзельнікі на аснове архіўных звестак і пошукавых экспедыцый аднавілі строі гарадской мяшчанкі канца XIX пачатку XX стагоддзя і строі замужняй жанчыны-сялянкі XVIII-XIX стагоддзяў. Вось што кажа пра рэканструкцыю строяў мясцовая жыхарка Людміла ГАНЕБНАЯ *(на фота справа)* — майстрыха па ткацтве, дырэктар Цэнтра рамёстваў: «Гэтыя строі складаюцца з асноўных элементаў — кашулі, жылеткі, фартуха, андарака, пояса, наміткі. Мінулай зімой я вышывала карункі на рукавах і наплечніках — капіявала іх з аўтэнтычнай кашулі, ткала пояс, падбірала колер, выкройвала і шыла іншыя часткі касцюма».

Подыум для дэфіле строяў выбралі менавіта каля крыніцы. Людміла Ганебная і кіраўнік гуртка па пляценні і вязанні Яўгенія КОЗЕЛ прыйшлі з гліняным посудам ад старых майстроў, каб падкрэсліць натуральнае асяроддзе, спалучэнне сучаснасці і старажытнасці.

**Анатоль КЛЯШЧУК, фота аўтара, *Мёрскі раён.***

## КОРАТКА

• Амаль 500 тысяч беларускіх дзяцей атрымліваюць дзяржаўныя дапамогі.

**• На ўчарашні дзень перапісу штодня запаўнялі апытальнікі па інтэрнэце каля 100—120 тыс. чалавек.**

• Больш за дзве тысячы цяжарнасцяў захавалі ў Беларусі ў 2018 годзе, дзякуючы перадабортнаму кансультаванню.



**• На жыхара Віцебска, які на электрасамакаце збіў дзвюх жанчын і ўцёк, заведзена крымінальная справа.**

ISSN 1990 - 763X



Фота БелТА.

На свае вочы

# ПЕРАПІС АНЛАЙН

## Яго пратэставаў карэспандэнт «Звязды»

**4 кастрычніка ў 00.00 стартаваў перапіс насельніцтва. Гэта ўжо трэцяя падобная кампанія ў незалежнай Беларусі — да таго перапісы праходзілі ў 1999 і 2009 гадах. Разыначкай сёлетняй кампаніі стала магчымасць перапісацца ў рэжыме анлайн. Але наколькі цяжка гэта зрабіць? Раказваем у дзесяці кроках.**

**СТАР. 4**

# «ЗРОБЛЕНА Ў БЕЛАРУСІ» — ЗНАК ЯКАСЦІ Ў ГРУЗІІ

## Аляксандр Лукашэнка і Георгій Маргвелашвілі абмеркавалі палітычны парадак дня і абмяняліся ўспамінамі

**На сустрэчы ў Палацы Незалежнасці былы прэзідэнт Грузіі перш за ўсё перадаў з вялікім гонарам прывітанне і словы любові ад шматлікіх грузін — якія нават асабіста і не ведаюць Аляксандра Лукашэнку.**

«Я лічу, што беларусы заслужылі ад грузін такую любоў, бо мы заўсёды з павагай ставіліся да грузінскага народа. Я вам расказваў: з савецкіх часоў паважалі, любілі, зайздросцілі — таму што грузіны былі самымі прасунутымі, усе ездзілі на «Волгах», чорных ці белых, а мы ў іх вучыліся», — з усмешкай прыгадаў беларускі лідар, чым і госця развесяліў.

Георгій Маргвелашвілі падкрэсліў, што добрыя, трывалыя, шчырыя стасункі цяпер падмацаваныя актыўнымі двухбаковымі сустрэчамі, якія ініцыявала Беларусь. Такія прызнанні — не простыя словы: насуперак агульнай ліній на салідарызацыю з пазіцыяй заходніх дзяржаў Тбілісі не падтрымлівае антыбеларускія ініцыятывы і заявы ЕС і ЗША ў рамках АБСЕ. У фармаце «Усходняга партнёрства» Грузія таксама традыцыйна выступае супраць дыскрымінацыі Беларусі. Дарэчы, наша дагаворная база налічвае больш за 60 пагадненняў.

«Як у Грузіі ставяцца да любога беларускага прадукту! Як ставяцца да актыўнага развіцця эканамічных адносін паміж дзвюма краінамі! Гандлёвая марка «Беларусь» стала брэндам якасці», — і аб гэтым прадстаўнік грузінскага народа імкнуўся сказаць Аляксандру Лукашэнку асабіста.

Асобна Георгій Маргвелашвілі падзякаваў за правядзенне фестывалю «Тбілісоба» ў Мінску. І хоць Аляксандр Лукашэнка адзначыў, што гэта заслуга не кіраўніка краіны, а грузін, — госць не згадзіўся: «Не ўсюды так атрымалася». Паколькі, сапраўды, у Мінску плошча ледзь умясціла ўсіх зацікаўленых, трэба паўтараць падобныя святы часцей, зрабіў выснову кіраўнік Беларусі.

«Калісьці марылі закласці фундамент, дык сёння ў нас ужо нешта атрымалася, ужо можна будаваць дом нейкі», — падвёў прамежкавы вынік развіцця беларуска-грузінскіх адносін Прэзідэнт.

У размове з журналістамі былы кіраўнік Грузіі засведчыў, што дынаміка беларуска-грузінскіх адносін уражвае: закладзенае пры першым візіце Аляксандра Лукашэнкі ў 2015 годзе актыўна развіваецца.

На думку госця, Мінск становіцца горадам сур'ёзных міжнародных перамоў, форумаў і канферэнцый. Так, сёння сам Георгій Маргвелашвілі прыме ўдзел у форуме «Мінскі дыялог».

«Аляксандр Рыгоравіч заўсёды падтрымліваў менавіта гэтую пазіцыю: давайце размаўляць і стварац, аднаўляць разбураныя масты, прызнаючы інтарэсы адзін аднаго», — сказаў Георгій Маргвелашвілі.

Падчас інтэрв'ю экс-прэзідэнт Грузіі прызнаўся, што імкнецца спаборнічаць з Аляксандрам Лукашэнкам у частцы сельскай гаспадаркі, вырошчваючы беларускую бульбу.

«Пакуль што ў яго лепшы ўраджай, але мы працуем над гэтым. Беларуская сарты бульбы добра ідуць — і ў мяне, і ў суседзяў, якім потым яе даю», — адзначыў Георгій Маргвелашвілі, назваўшы сябе дасведчаным фермерам.

**Варвара МАРОЗАВА.**

# Двайная нагода

**Адбылася тэлефонная размова Прэзідэнта Беларусі Аляксандра Лукашэнкі з Прэзідэнтам Расіі Уладзімірам Пуціным.**

Кіраўнікі дзяржаў абмеркавалі развіццё беларуска-расійскіх адносін, узаемадзеянне на пляцоўках інтэграцыйных аб'яднанняў, у тым ліку падрыхтоўку важных двухбаковых дакументаў напярэдадні 20-годдзя Дагавора аб стварэнні Саюзнай дзяржавы, паведамляе прэс-служба лідара Беларусі.

Суразмоўнікі падкрэслілі выключна сяброўскі і братэрскі характар адносін паміж краінамі, накіраванасць на паглыбленне ўзаемавыгаднага партнёрства.

Аляксандр Лукашэнка таксама выказаў Уладзіміру Пуціну самыя цёплыя віншаванні з нагоды яго дня нараджэння.

Блізкая ўлада

# Газіфікацыя, зямля для фермера і дарогі

**Дзевяць чалавек з Мінскага раёна выслухаў кіраўнік цэнтральнага рэгіёна Анатоль ІСАЧАНКА падчас чарговага прыёму грамадзян.**

Старшыня вытворчага кааператыва «Рогаўскі» Юрый Лешуноў расказаў, што да іх ніяк не можа прыйсці «блакітнае паліва». Ён паведаміў, што кааператыў быў створаны ў 2004 годзе, у яго ўваходзіць больш за восемдзесят чалавек. За гэты час былі распрацаваны два праекты, але газіфікацыя так і не пачалася. Па словах спецыялістаў, кааператыў быў пастаўлены на чаргу для газіфікацыі ў 2011 годзе, у якой зараз восьмы па ліку. Для таго каб падвесці газ менавіта «Рогаўскаму», неабходна 769 тысяч рублёў, 30 % з іх трэба ўнесці фізічным асобам, астатнія 70 % — з дзяржаўнага бюджэту. Сёлета выдзелены сродкі на два кааператывы, у наступным годзе мяркуецца іх выдзеліць яшчэ на чатыры кааператывы. «Калі раён знойдзе грошы на газіфікацыю гэтага кааператыва, то ў 2021-м можна будзе разглядаць пытанне па газіфікацыі», — канстатаваў Анатоль Ісачанка. Анатоль Міхайлавіч даручыў старшыні Мінскага райвыканкама Івану Крупко дэталёва вывучыць сітуацыю, сустрэцца з людзьмі і разам падлічыць, колькі неабходна грошай для вырашэння пытання і ці згодны ўсе яны ўнесці неабходную суму.

Станіслаў Вячаслававіч і Максім Іванавіч з вёскі Лескаўка заклапочаны, што да новай школы неўладкавана дарога, няма тратуараў, асвятлення. Пасля дажджу, у непагадзь яна размываецца. Але самае галоўнае, што небяспеку для малых пешаходаў ствараюць машыны. Анатоль Ісачанка даў даручэнне яшчэ раз прааналізаваць сітуацыю з выездам на месца. Распрацаваць праект і па магчымасці пабудаваць спачатку бакавую пешаходную сцежку для школьнікаў, а ўжо затым зрабіць гравійку.

Дарожная праблема хвалявала і жыхара Астрашыцкага Гарадка Станіслава Мікалаевіча. Ён паскардзіўся, што каля яго дома няякасна, з парушэннямі пракладзены ўчастак дарогі, таму вада сцякае ў агарод, у выніку згніла агароджа. Анатоль Ісачанка, пагладзеўшы слайды, прыйшоў да высновы, што і раней тут не было плота. Звярнуў ён увагу і на тое, што тэрыторыя вакол дома ў непрыглядным стане, за ёй ніхто не даглядае. А вясковая дарога на самай справе роўная, заасфальтаваная. Далёка не ў кожным населеным пункце ёсць такая. Між іншым, старшыня Мінаблвыканкама даручыў спецыялістам выехаць да заяўніка і ацаніць, наколькі стан дарогі ўплывае на разбурэнне агароджы.

Напрыканцы прыёму Анатоль Ісачанка канстатаваў, што яшчэ некалькі гадоў таму заяўнікі ў асноўным падымалі грамадскія праблемы. Як сведчаць апошнія прыёмы, пераважная большасць людзей звяртаецца з просьбай дапамагчы вырашыць асабістыя праблемы. А гэта значыць, што грамадскім пытанням больш увагі сталі аддаваць мясцовыя ўлады.

**Таццяна ЛАЗОЎСКАЯ.**

# «МІНСКІ ДЫЯЛОГ» ПРА ЕЎРАПЕЙСКУЮ БЯСПЕКУ — нейтральная пляцоўка і высокі ўзровень даверу

**Абмеркаваць выклікі XXI стагоддзя, у прыватнасці сістэму кантролю над узбраеннямі, напружанасць паміж геапалітычнымі сапернікамі і адсутнасць камунікацый і паразумення паміж ваеннымі і палітыкамі з'ехалася каля 700 экспертаў, дыпламатаў і палітыкаў з 61 краіны свету. На сустрэчы ў Мінску разважаюць, як не даць свету саслізгнуць у бездань.**

У сучаснай сітуацыі татальнага абвастрэння супярэчнасцяў, калі бакі нават не размаўляюць адно з адным, тое, што яны сабраліся тут, ужо само па сабе важнае дасягненне, заўважыў **Яўген ПРЭЙГЕРМАН, заснавальнік і дырэктар Савета па міжнародных адносінах «Мінскі дыялог»**, які з'яўляецца арганізатарам мерапрыемства:

— Ад нашых партнёраў мы пачулі, што Мінск мае такую аўру, што людзі нават з самымі супрацьлеглымі пунктамі гледжання знаходзяць тут магчымасць скончыць дыскусію канструктыўна, нават калі яна пачыналася на эмоцыях. Таму мы чакаем сёлета, што аўра гэтая будзе ўмацоўвацца і падобнага кшталту дыскусіі будуць працягвацца. Гэты форум не абстрактна акадэмічны, тут сабралася шмат дзеючых палітыкаў, якім неабходны дакладныя прапановы і рашэнні. Таму наша задача па выніках сустрэчы сабраць усё самае цікавае ў выніковым дакументе, каб гэтыя ідэі можна было распрацоўваць.

Еўрапейскі рэгіён імкліва ўваходзіць у эпоху стратэгічнай нестабільнасці і непрадказальнасці. Існуючыя правілы гульні ў сферы бяспекі ўжо не ў стане перадухіліць новыя і вырашыць існуючыя канфлікты ў Еўропе. Усё гэта павышае верагоднасць развіцця сілавых сцэнарыяў, мяркуе **Уладзімір МАКЕЙ, міністр замежных спраў Беларусі:**

— Еўропа і Беларусь як яе неад'емная частка заўжды асоба вострa адчувалі любы подых ветру міжнароднай бяспекі. А ў апошнія гады мы жывём пры пастаянным штармавым папярэджанні. Часы, калі на Еўрапейскім кантыненце ўладарыў дух міру і здаровага партнёрства, знесены парывамі геапалітычнай напружанасці і канфрантацыі. Магчымасць узаемнага стрымлівання праз нарошчванне ваенных патэнцыялаў — небяспечная ілюзія бяспекі, якая не адночы прыводзіла да трагедый. Гэта прамы шлях да халодных войнаў.

Ён падкрэсліў як важнасць прысутнасці экспертаў розных узроўняў, так і актуальнасць ды тэматычнасць абмяркоўваемых пытанняў міжнароднай і рэгіянальнай бяспекі. І адзначыў, што форум — унікальная магчымасць не проста абмяняцца думкамі, але і паспрабаваць выпрацаваць агульныя падыходы, а таксама практычныя алгарытмы вырашэння праблем, якія не проста наспелі, а нават і перасПелі.

Мяркуючы па колькасці ўдзельнікаў і краін, у свеце вераць у патэнцыял мінскай пляцоўкі як міжнароднага перагаворнага круглага стала для вырашэння найбольш значных праблем, якія існуюць не толькі ў нашым рэгіёне, але і ў цэлым у Еўразіі і ў свеце, бо ўсе яны звязаныя, падкрэсліў важнасць форуму **Валерый ВАРАНЕЦКІ, старшыня Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў па міжнародных справах:**

— Аўтарытэт і імідж мінскай перагаворнай пляцоўкі сапраўды падрос, і многія вераць, што на ёй як на нейтральнай пляцоўцы можна весці шчырую і адкрытую размову. Мае калегі са Швейцарыі ўжо кажуць, што мы сталі другой Жэневай для Усходняй Еўропы і нават Еўразіі. Важна разумець, што такія пляцоўкі дазваляюць фармуляваць падыходы і пазіцыі, і калі яны скіраваны на ўзаемаразуменне, а не на стварэнне напружанасці, то гэта вельмі важна.

Гэта важна для краіны і з пункту гледжання забеспячэння бяспекі, стабільнасці і супрацоўніцтва, гэта наш нацыянальны інтарэс. Мы зацікаўлены ў існаванні дыялогу паміж Захадам і Усходам.

**Ірына СІДАРОК.**

# ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

## У Швецыі праваліліся перагаворы ЗША і КНДР

Двухбаковая рабочая сустрэча ў Швецыі паміж дэлегацыямі ЗША і Паўночнай Карэі была перапынена. Пасол па асобых даручэннях МЗС КНДР Кім Мён Гіль абвінавацconfigured у гэтым Злучаныя Штаты, заявіўшы, што амерыканцы (дэлегацыю ўзначальваў Стывен Біган) прыйшлі за стол перагавораў з «пустымі рукамі» і не ўлічылі патрабаванні КНДР, чым «адбілі ўсялякае імкненне да дыскусіі». Пра гэта паведамляюць інфармацыйныя агенцтвы. Кім Мён Гіль таксама сказаў, што менавіта ад Вашынгтона залежыць, ці будзе Пхеньян працягваць эксперыментальныя запускі міжкантынентальных балістычных ракет. «Гэтая сустрэча скончылася разрывам, — падкрэсліў дыпламат. — Могуць адбыцца вялікія непрыемнасці, калі ЗША не будуць старанна рыхтавацца да такіх кантактаў». Перагаворы ў Швецыі былі нацэлены на дасягненне прагрэсу ў рэалізацыі пагаднення, заключанага падчас першага саміту ЗША — КНДР у Сінгапуры ў чэрвені 2018 года. Другі саміт адбыўся ў лютым 2019 года ў Ханоі, тады дыялог зайшоў у тупік. Чакалася, што ў Швецыі ў цэнтры абмеркаванняў будзе магчымы дэмантаж часткі ядзерных аб'ектаў у пачнакарэйскім Ёнбёне ў абмен на паслабленне санкцый з боку ЗША.

## Падчас пратэстаў у Іраку загінула больш чым 110 чалавек

Колькасць загінулых у выніку народных пратэстаў у Іраку, якія працягваюцца з 1 кастрычніка, перавысіла 110 чалавек, больш за 4,1 тысячы пацярпелі, паведаміла іракскае інфармагенцтва «ВАІД» са спасылкай на медыцынскія крыніцы. Сярод ахвяр, як падкрэслівае агенцтва, 13 дэманстрантаў, якія загінулі ў ходзе суботніх акцый у Багдадзе і гарадах Эль-Дывания і Эль-Насірыя. Каля 200 пацярпелых знаходзяцца ў бальніцах у цяжкім стане. У Іраку з пачатку кастрычніка праходзяць народныя антыўрадавыя пратэсты, якія пачаліся з прызыву выйсці на вуліцу, што распаўсюджваліся ў сацсетках, з патрабаваннямі ўзмацнення барацьбы з карупцыяй, зніжэння беспрацоўя, паляпшэння работы камунальных службаў. Яны сталі першымі пасля прызначэння год таму ўрада Адэля Абд аль-Махдзі. Ні адна партыя ці палітычны лідар не заявілі пра тое, што стаяць за гэтымі пратэстамі. ААН запатрабавала спыніць гвалт у дачыненні да грамадзянскіх асоб у Іраку і правесці адкрытае расследаванне гібелі мірных пратэстоўцаў.

## Папа ўзвёў у сан 13 кардыналаў



Папа Рымскі Францыск падчас кансісторыі ў саборы Святога Пятра ўзвёў у кардынальскую годнасць 13 іерархаў рымска-каталіцкай царквы. У іх ліку прэзідэнт Папскай рады па міжрэлігійным дыялогу іспанец Мігель Анхель Аюса Гіксот, архіварыус і бібліятэкар Святой Рымскай царквы партугалец Жазэ Талянціна Мендонса, а таксама адказны супрацоўнік Дыкастэрыі па службе суцэльнага чалавечага развіцця канадзец Майкл Чэрны, ён курыруе пытанні, звязаныя з мігрантамі. Звяртаючыся да кардыналаў, пантыфік сказаў, што яны павінны праяўляць спачуванне да тых, хто пакутуе. «Так шмат супрацьпраўных дзеянняў з боку святароў нараджаецца з-за адсутнасці пачуцця спагады, звычкі адводзіць пагляд, звычкі заставацца абыякавым», — адзначыў Францыск. 10 з 13 кардыналаў маладзейшыя за 80 гадоў, значыць, маюць права ўдзельнічаць у канклаве па выбарах Папы Рымскага. Новыя кардыналы прадстаўляюць розныя краіны свету, у тым ліку Кубу, Дэмакратычную Рэспубліку Конга, Гватэмалу і Інданезію.

Повязь часоў

# Першай сталіцы ВКЛ — 975

## Рыцарскія баі, кнігі пра Гродзеншчыну і вянчанне Ягайлы ў падарунак Навагрудку

**Сіла мінулага — у гісторыі, сіла будучага — у нас, кажуць тутэйшыя пра сябе і сваю малую, але знакамітую на ўвесь свет радзіму. Адзін з самых багатых гарадоў Панямоння, дзе праводзіліся дзяржаўныя сеймы і сустракаліся каралі і паслы. Горад, дзе праходзілі рады і пасяджэнні вышэйшага апеляцыйнага суда — галоўнага літоўскага трыбунала, дзе каранаваўся Міндоўг. Першая сталіца ВКЛ, гістарычныя жыхары якой змагаліся супраць тэўтонцаў, а сучасныя — супрацьстаялі нямецкім захопнікам... Навагрудак на выхадных гучна і квяціста адзначыў юбілей.**

### Ведай мінулае, любі сучаснае

Асноўныя падзеі, што на працягу амаль дзесяці стагоддзяў адбываліся на навагрудскай зямлі, паказалі гледачам праз тэатралізавана-музычнае відовішча, якое выклікала не толькі словы захаплення, а і слёзы суперажывання справам продкаў.

Насычаная духам гісторыі, сённяшняя Навагрудчына дынамічна развіваецца і рашуча настроена перадаць эстафету добрых спраў будучым пакаленням, упэўнены **Сяргей ФЕДЧАНКА, старшыня Навагрудскага райвыканкама:**

— Помнікі гісторыі, нібыта кадры старой кінастужкі, дэманструюць багатае мінулае зямлі. Працягам мужнасці і годнасці абаронцаў старажытнага Навагрудскага замка, які стагоддзямі быў цвярдыняй на шляху іншаземных захопнікаў, стаў подзвіг герояў Вялікай Айчыннай вайны. Абапіраючыся на шматвекавыя традыцыі і здзяйсненні нашых продкаў, сучаснікі працягваюць рэалізоўваць іх поспехі ў сваіх справах.

Да свята, у прыватнасці, адкрылі памятны знак «Уязная брама», сквер і цэнтр сацыяльнага абслугоўвання насельніцтва.

— Навагрудская зямля асаблівая, яна ведала часы росквіту і цяжкіх выпрабаванняў. Сучасны край дэманструе непарыўную сувязь глыбокіх традыцый і дынамічнага развіцця, а сённяшні і заўтрашні дні ў надзейных руках мясцовых жыхароў, — падкрэсліў **Анатоль МАРКЕВІЧ, памочнік Прэзідэнта Беларусі, інспектар па Брэсцкай вобласці,** які ў свой час узначальваў Навагрудскі выканкам.



### Гродна, Слонім, Навагрудак...

Павіншаваць горад прыехалі таксама дэлегацыі з краін-суседак: Польшчы, Расіі, Літвы і Украіны. А вядомы **гісторык і краязнавец Уладзімір ЛІХАДЗЕДАЎ** прэзентаваў кнігу «Навагрудак. Падарожжа праз час». Некаторыя паштоўкі і фотаздымкі з выявамі горада, сабраныя калекцыянерам, у гэтым выданні ўпершыню пабачылі свет. Каментары аўтара прадстаўлены ў кнізе на рускай, беларускай і англійскай мовах.

— Унікальныя гістарычныя здымкі з відамі Навагрудка дазваляюць прасачыць, як развіваўся горад з канца XIX стагоддзя па 1930-я гады, — заўважыў Уладзімір Ліхадзедаў і выказаў спадзяванне, што яны дапамогуць у вывучэнні навагрудскай гісторыі.

За апошні год, дарэчы, выпушчана ўжо тры кнігі з серыі выданняў пра гарады Гродзеншчыны. Пабачылі свет экзэмпляры пра Гродна, Слонім і Навагрудак. У канцы лістапада да дажынак выйдзе выданне пра Смаргонь, абвясціў **намеснік старшыні Гродзенскага аблвыканкама Віктар ЛІСКОВІЧ:**

— Налета ёсць творчая дамова з аўтарам на выданне кніг пра Гродзенскі раён, Шчучын, Ваўкавыск, Ліду і Карэлічы. У наступныя дватры гады поўная серыя кніг, прысвечаных кожнаму раёну Гродзенскай вобласці, пабачыць свет. Гэтыя кнігі — найлепшае пацвярджэнне таму, як мы выраслі за апошнія гады.



### І пабіцца, і пад'есці

Гістарычная рэканструкцыя «Меч караля», якую ў Навагрудскім замку арганізавалі ваенна-гістарычныя клубы, была адной з галоўных падзей свята. Турнір лучнікаў, конныя міле, рыцарскія паядынкі... Усё, здавалася, як звычайна, аднак да юбілею, па словах арганізатараў, падрыхтавалі і навінкі. Напрыклад, правялі гістарычны эксперымент са стральбой па мішэнях сапраўднымі баявымі стрэламі і конныя сутычкі на ўсім скаку.

Стралялі таксама і па зменных цэлях, якія лучнікі не бачылі, пакуль не абарочваліся. Рыцары на скаку секлі капусту і білі адзін аднаго баявымі цапамі, дзідамі, маргенштэрнамі і мячамі.

Пакуль мужчыны стараліся няхай і не па-сапраўднаму, але «знесці» галаву апаненту ў паядынках, змагаючыся за ўвагу прыгажунь Сяржнявечча, іх баявыя сяброўкі завіхаліся ў стане, каб ваяры не працягнулі ногі з голаду.

Юлія (у рэканструкцыі — Марта) гатавала піражкі з зелянінай, тварагом і маладым сырам. Гэтая страва падаецца з соусам з мёду, гарчыцы, прыпраў і масла, кажа яна.

Дзяўчына ўваходзіць у клуб, які аднаўляе гісторыю 1410—1430 гадоў, калі адбываліся бойкі пры Вялікаміры. Марта з чэшскага воза — табарытаў. Другі воз — літоўскае капʼё. Сёння яна гатуе на 19 чалавек і яшчэ гасцей частуе. Прычым, трэба гэта зрабіць яшчэ па канонах тых часоў, каб не адступаць ад гістарычнасці па магчымасці.

— Мы гатуем на тлушчы, бо і холадна, і рыцарам трэба хутка падсілкавацца пасля баёў, п'ем цёплае віно са «спакойнымі спецыямі», якое даўней нават дзецям давалі. Такім напоем таксама грэемся, — усміхаецца Марта. — Піражкі ляпіла проста тут, на гары каля замка. А на вячэру будзе курыца з фасоляй.

Апафеозам гістарычных гульняў стала рэканструкцыя вянчання і шлюбу караля Польшчы і вялікага князя літоўскага Ягайлы з княжной Соф'яй Гальшанскай, ад якіх пайшла дынастыя Ягелонаў. Гэты саюз на працягу двух наступных стагоддзяў уплываў на ход еўрапейскай палітыкі, сведчаць гісторыкі.

Юбілей Навагрудка насамрэч аказаўся насычаным і яскравым. Гэта даказалі як шматлікія мерапрыемствы, што праходзілі ў горадзе падчас святкавання, так і госці свята, якія да позняй ночы, нягледзячы на халоднае надвор'е, удзельнічалі ва ўсіх забаўках і весяліліся напоўніцу.

**Ірына СІДАРОК.**
**Фота аўтара.**



Надвор'е

## НАС ПАДМАРОЗІЦЬ, АЛЕ НЕНАДОЎГА

### А да нядзелі на поўдні краіны будзе прыграваць да плюс 20-21 градуса

**У найбліжэйшы час у нас захаваецца халоднае з ападкамі і начнымі замаразкамі надвор'е, але ў сярэдзіне тыдня яно пачне мяняцца, заходнія і паўднёва-заходнія патокі ў атмасферы прынясуць цёплае вільготнае паветра атлантычнага паходжання, паведамілі спецыялісты Рэспубліканскага цэнтра па гідраметэаралогіі, кантролі радыеактыўнага забруджвання і маніторынгу навакольнага асяроддзя Мінпрыроды. Ужо ў другой палове тыдня чакаюцца цёплыя дажджы, а тэмпературны фон пачне павышацца.**

У сераду атмасферныя франты, якія перамяшчаюцца з боку Заходняй Еўропы, абумовяць на большай частцы тэрыторыі Беларусі кароткачасовыя дажджы. Замаразкаў ужо не будзе. Тэмпература паветра ўначы складзе ад плюс 1 да плюс 8 градусаў, а ўдзень будзе ад плюс 7 градусаў па ўсходзе да плюс 14 градусаў на захадзе краіны.

У чацвер і пятніцу, у пачатку другой дэкады кастрычніка, на большай частцы тэрыторыі краіны пройдуць кароткачасовыя дажджы. Уначы і раніцай у асобных раёнах туман. Тэмпература паветра ўначы складзе 3—10 цяпла, удзень — 7—14 градусаў з плюсам.

Паводле папярэдніх прагнозаў айчынных сіноптыкаў, у суботу на большай частцы тэрыторыі краіны таксама пройдуць кароткачасовыя дажджы. Уначы і раніцай у асобных раёнах будзе туман. У начныя гадзіны чакаецца ўжо ад 4 да 10 цяпла, а ўдзень тэмпература паднімецца да 9—16 градусаў. У нядзелю наогул будзе амаль майскае надвор'е. У гэты дзень месцамі, пераважна па паўночнай палове краіны, прагназуюцца кароткачасовыя дажджы. Уначы і раніцай у асобных раёнах будзе туман. Тэмпература паветра ўначы складзе ад плюс 5 да плюс 11 градусаў, а ўдзень стане зусім камфортна — ад плюс 11 да плюс 18, па поўдні ж краіны паветра прагрэецца да плюс 19-21 градуса.

**Сяргей КУРКАЧ.**

Факт

## Нашы золатавалютныя рэзервы — 8,83 млрд долараў

**Міжнародныя рэзервовыя актывы Беларусі, паводле папярэдніх ацэнак на 1 кастрычніка, склалі 8830,9 млн долараў ЗША (у эквіваленце).**

За верасень золатавалютныя рэзервы знізіліся на 60,1 млн долараў (на 0,7 %) пасля росту ў жніўні на 263,1 млн долараў (на 3 %). Зніжэнне ўзроўню міжнародных рэзервовых актываў па выніках верасня абумоўлена планавым пагашэннем урадам і Нацыянальным банкам краіны знешніх і ўнутраных абавязацельстваў у замежнай валюце на агульную суму каля 355 млн долараў.

Падтрыманню ўзроўню золатавалютных рэзерваў у верасні спрыялі паступленне замежнай валюты ў бюджэт, у тым ліку ад збірання экспартных пошлін на нафту і нафтапрадукты, купля замежнай валюты Нацыянальным банкам на таргах ААТ «Беларуская валютна-фондавая біржа», паступленне сродкаў ад продажу Міністэрствам фінансаў аблігацый, намінаваных у замежнай валюце.

**Сяргей КУРКАЧ.**

## Смяротнае ДТЗ на заводзе

**Інцыдэнт адбыўся на Мазырскім НПЗ раніцай у панядзелак. У 8.35 паступіла паведамленне аб тым, што грузавая спецмашына з прычэпам сутыкнулася з аўтобусам, які перавозіў рабочых. У ім ехала 12 чалавек, паведаміла афіцыйны прадстаўнік МУС Вольга Чамаданава.**

З-за ўдару аўтобус перакуліўся на бок і прыдавіў аднаго з пасажыраў — 33-гадовага мужчыну выкінула з салона, ён загінуў. З траўмамі рознай ступені цяжкасці шпіталізаваны астатнія 11 рабочых. Кіроўцы абедзвюх машын не пацярпелі.

Дастаць людзей з аўтобуса дапамагалі ратавальнікі.

Па папярэдняй інфармацыі, аварыя адбылася з-за таго, што кіроўца спецмашыны, якая рухалася па другараднай дарозе, не саступіў дарогу аўтобусу, які ехаў па галоўным шляху. Дакладныя абставіны таго, што адбылося, высвятляе Следчы камітэт.

**Валяр'ян ШКЛЕННІК.**

## Вучэнне на ўсходзе Беларусі

**З 7 да 11 кастрычніка ў Магілёўскай і Гомельскай абласцях праходзіць тактыка-спецыяльнае вучэнне з вайсковай часцю 89417, паведамляе Міністэрства абароны.**

Вайскоўцы адпрацоўць дастаўку падраздзяленняў брыгады ў месцы выканання вучэбна-баявых задач па паветры і чыгункай. Асабовы склад будзе дэсантаваны з самалёта Іл-76 і верталёта Мі-8 у розных умовах надвор'я і ў розны час сутак. Ваенныя будуць праводзіць разведку, яны выкарыстаюць для гэтага ў тым ліку і беспілотныя авіякомплексы. Таксама ў праграме — вызваленне аэрадрома, захопленага ўмоўным праціўнікам.

**Валяр'ян ШКЛЕННІК.**


## СВЕДЕНИЯ О РЕЗУЛЬТАТАХ ПРОВЕДЕНИЯ РЕКЛАМНОЙ ИГРЫ «СНОВА В ШКОЛУ»

**Сведения об организаторе:**
Белорусско-эстонское совместное предприятие «ПРАЙМЭРИ» общество с ограниченной ответственностью с местом нахождения по адресу: 220030, Республика Беларусь, г. Минск, пер. Казарменный, дом 4, помещение 2. УНП 101132766.
**Наименование Рекламной игры:**
«Снова в школу»
**Срок начала и окончания Рекламной игры:**
Срок начала Рекламной игры – 1 сентября 2019 года;
Срок окончания Рекламной игры – 18 октября 2019 года.
**Сведения о государственной регистрации рекламной игры:**
Рекламная игра зарегистрирована Министерством антимонопольного регулирования и торговли Республики Беларусь 16 августа 2019 года, свидетельство о государственной регистрации рекламной игры № 3620.
**Сведения о количестве участников рекламной игры:**
В Рекламной игре приняло участие 342 человек(а).
**Сведения о розыгрыше призового фонда:**
Призовой фонд Рекламной игры разыгран полностью.
**Фамилии и инициалы победителей, их выигрыши:**
По одному Еженедельному призу, включающему в себя два подарочных сертификата 21vek+ стоимостью по 200,00 (двести) белорусских рублей каждый, действительные до 05.08.2020, а также денежные средства в размере 40,20 белорусского рубля, которые удерживаются Организатором для уплаты за Победителя подоходного налога с общей стоимости приза, выиграли:

| № п/п | Ф. И. О. Победителя |
|---|---|
| 1 | Демьянкова О. А. |
| 2 | Заяц А. С. |
| 3 | Астапович М. А. |
| 4 | Шукало О. В. |

**Телефон для справок по вопросам проведения рекламной игры:**
+ 375 17 239 07 87

# ПЕРАПІС АНЛАЙН

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

**1.** Заходзім на сайт census.by або перапіс.бел. Кожны з гэтых сайтаў мае дзве версіі — як беларуска-, так і рускамоўную. Уверсе таксама размешчана кнопка «Версія для людзей са слабым зрокам». Калі яе націснуць, то шрыфт візуальна павялічыцца, а афармленне старонкі зробіцца чорна-белым.

Па стане на 6.20 раніцы першага дня ўдзел у інтэрнэт-перапісе ўзялі 3620 чалавек. Атрымліваецца больш чым дзевяць чалавек у хвіліну. Вельмі нядрэнна для першых гадзін перапісу, тым больш у начны час.

**2.** Далей нам прапануюць увайсці ў сістэму інтэрнэт-перапісу. Калі вы ўжо зарэгістраваны ў міжбанкаўскай сістэме ідэнтыфікацыі, то можна аўтарызавацца з яе дапамогай. Я ж вырашыў увайсці пры дапамозе аднаразовага коду. Для гэтага трэба ўвесці 14-значны ідэнтыфікацыйны нумар, які ёсць у вашым пашпарце, і нумар мабільнага тэлефона.

**3.** Уводзім код і... паехалі. Забягаючы наперад: сам працэс інтэрнэт-перапісу ў вас зойме не больш за 20 хвілін.

**4.** Спачатку вас спытаюць пра адрас вашага пражывання і домагаспадарку.




Апошні тэрмін, скажам так, выкарыстоўваецца ў маўленні нячаста. Але злева тут жа даецца тлумачэнне, што ж гэта за «звер» такі. Каля кожнага пункта змешчаны падказкі — яны вам дапамогуць пры ўзнікненні цяжкасцяў пры разуменні фармулёўкі. Напрыклад, калі муж і жонка разведзены, але жывуць у адной кватэры і кожны з іх мае свой халадзільнік і гатуе ежу асобна, то гэта дзве гаспадаркі.

**5.** Далей усё проста: тып вашага жылля, яго плошча, які ў вас водаправод і каналізацыя, ці ёсць ванна, гарачае водазабеспячэнне, форма ўласнасці і колькасць пакояў.

**6.** А вось на гэтым этапе пачынаюцца пытанні асабістыя. Тут у вас спытаюць пра сямейнае становішча, месца вашага нараджэння, ці збіраецеся пераязджаць з Беларусі. Якое ў вас грамадзянства? Да якой нацыянальнасці сябе адносіце? Моўны раздзел прысвечаны двум пытанням — вашай роднай мове (якую вы першай засвоілі ў дзяцінстве) і той, на якой вы размаўляеце дома. Жанчынам таксама прапануюць адказаць на некалькі чыста гендарных пытанняў — колькі дзяцей яны нарадзілі і колькі плануюць.

**7.** І пра крыніцы вашага заробку таксама спытаюць.

**8.** Апошнія пытанні прысвечаны сельскай гаспадарцы. Яны патрэбны толькі тады, калі ў вас ёсць зямельны ўчастак або жывёлы. Кароў і катоў з сабакамі рэгістраваць не трэба.

**9.** Адпраўляем звесткі. Пытанні скончыліся, і... раптам сістэма выдае прыемны сюрпрыз. «Вы сталі адным з удзельнікаў інтэрнэт-перапісу, які можа атрымаць смартфон Xiaomi. Кожны дзень — адзін Redmi Note 8 Pro». Ну... чаму б і не?

**10.** І пампуем адмысловы сертыфікат, як тое раілі ў Нацыянальным статыстычным камітэце. Ён спатрэбіцца, калі раптам да вас прыйдуць перапісчыкі. Ні вы, ні яны не будзеце губляць час.

Адным словам, інтэрнэт-перапіс — гэта вельмі добра і зручна! Апоўдні панядзелка колькасць тых, хто ўзяў у ім удзел, перасягнула праз 400 тысяч.

**Валяр'ян ШКЛЕННІК.**




Здарэнне

## Коўдры са «зніжкай» для ветэрана

Жанчына забрала ўсе зберажэнні пенсіянера

**У аператыўна-дзяжурную службу Добрушскага РАУС звярнуўся жыхар вёскі Лагуны 1927 года нараджэння. Невядомая жанчына скрала ў яго тры тысячы рублёў і ўцякла.**

Аператыўнікам абласнога ўпраўлення крымінальнага вышуку пенсіянер расказаў, што ўдзень да яго прыйшла жанчына і сказала, што ветэранам Вялікай Айчыннай вайны прадугледжаны падарунак — новыя коўдры з максімальнай зніжкай, — і назвала суму, якую неабходна заплаціць. Дзядуля пагадзіўся, прынёс усе свае зберажэнні і паклаў на стол. Госця, убачыўшы стос купюр, сказала, што гэтага хопіць, на вачах у гаспадара схапіла грошы і выскачыла з хаты.

Сышчыкі апыталі іншых жыхароў вёскі. Тыя паведамілі, што прадаўшчыца ездзіла на аўтамабілі «Жыгулі» чырвонага колеру, заходзіла да іх, прапаноўваючы тавар. Узяўшы на ўзбраенне прыкметы і марку аўто, міліцыянеры выйшлі на след невядомай.

Па факце здзяйснення рабавання заведзена крымінальная справа. Падазраваная гамяльчанка 1977 года нараджэння затрымана, частка выкрадзенага канфіскавана, паведамляе УУС Гомельскага аблвыканкама.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

Юркансультацыя

# Найперш грошы — пасля кватэра?

## Як засцерагчыся ад падману рыэлтараў і што патрабаваць ад агенцтва

**Дагавор не склалі, чэк не выдалі, жыллё не знайшлі, але перадаплату ўзялі, на скаргі не рэагавалі... Па такім прынцыпе, калі і грошы атрыманы, і напружвацца пошукамі варыянтаў нерухомасці не трэба — дастаткова ўліцця некалькі нумароў тэлефонаў даць, а далей, маўляў, варушыся сам, мы сваю справу зрабілі — любяць працаваць нядобрасумленныя агенцтвы ў нашай краіне. Заканадаўча забараніць аказваць паслугі па найме жылля з перадаплатай намагаецца Міністэрства юстыцыі Беларусі. Пакуль гэтага не адбылося, ведамства змагаецца з махлярамі шляхам штрафаў, папярэджанняў і закрыцця ўстаноў. З 4 кастрычніка спыняе сваё існаванне чарговая «кантора» — агенцтва нерухомасці «Вікторыя». Усім, хто мае з ім дагаворы, трэба скасаваць іх.**



### НІ ЧЭКА, НІ ДАГАВОРА

Валерый з Салігорска шукаў дачцэ кватэру ў сталіцы. Звярнуўся ў агенцтва, а далей...

— У агенцтве мне сказалі, што нумары тэлефонаў уласнікаў дадуць толькі пасля заключэння дагавора і аплаты паслуг у памеры 76,5 рубля. Я аддаў грошы, але чэк не атрымаў. Дагавор на аказанне паслуг са мной не падпісалі — проста выдалі ўжо гатовы бланк без подпісу, які быў у арганізацыі, — расказвае пацярпелы. — Мне напісалі два нумары, на якім неабходна было пазваніць праз 1,5 гадзіны. Ніхто не адказаў. Тое ж паўтарылася і з наступнымі нумарамі, якія я ўжо запатрабаваў пасля, прыязджаючы ў агенцтва. Стаміўшыся ад казачных абяцанняў і дарэмных тэлефанаванняў, пажадаў вярнуць грошы і скасаваць дагавор. Вось тут і пачаліся абразы, а я даведаўся, што падпісанага дагавору ў мяне няма. І грошы мне, нягледзячы на тое што паслугу так і не аказалі, не вярнулі.

Салігарчанін звярнуўся ў Мінюст, дзе папрасіў ацаніць дзеянні агенцтва. Мужчына кажа: не тое крыўдна, што страціў грошы, а тое, што аналагічна рыэлтары дзейнічалі і з іншымі кліентамі.

— Некаторыя з іх студэнты, і не з усімі, хто хоча вучыцца і шукае жыллё, могуць прыехаць бацькі. Гэтым агенцтва і карыстаецца, бо абараніць свае інтарэсы моладзі значна цяжэй, — абураецца Валерый.

**Неабходна на заканадаўчым узроўні прадугледзець, як паслугі па найме жылля аплачваліся толькі пасля таго, калі спажыўцу падбяруць патрэбны аб'ект нерухомасці.**

Пасля скаргі пацярпелага камісія міністэрства пачала праверку. З агенцтва мужчыну пачалі званіць і пісаць СМС з просьбамі адазваць скаргу, прапанавалі вярнуць грошы, патлумачылі, што ўжо разбіраюцца з вінаватымі і пагаджаліся на ўсе ўмовы Валерыя.

### ЗАМЕСТ ЖЫЛЛЯ — КАНСУЛЬТАЦЫЯ ПА ЗДЗЕЛКАХ

У Мінюсце патлумачылі, што ліцэнзіі на работу агенцтва пазбавілі таму, што скарга Валерыя ўжо не першая, парушэнні — татсама. Супрацоўнікі арганізацыі аказвалі паслугі без пісьмовага дагавора, а раней, на пачатку года, «Вікторыі» ўжо дасылалі з міністэрства прадпісанне з указаннем тэрміну для ліквідацыі аналагічных парушэнняў. Тады са скаргай на прадстаўленне рыэлтарамі недакладнай інфармацыі ў Мінюст звярнулася жанчына.

— Пры заключэнні з грамадзянкай дагавора на аказанне рыэлтарскіх паслуг агенцтва не выканала патрабаванні адносна парадку рэгістрацыі дакумента. Дагавор павінен быць складзены не менш чым у двух экземплярах, адзін з якіх выдаецца кліенту, а другі застаецца ў агенцтве, — кажа **Дзіяна ПАДЛЕСКАЯ, начальнік упраўлення адвакатуры і ліцэнзавання юрыдычнай дзейнасці Міністэрства юстыцыі Беларусі.** — Дагавор падпісваецца спажыўцом паслугі і кіраўніком або ўпаўнаважаным намеснікам рыэлтарскай арганізацыі і рэгіструецца ў дзень падпісання ў кнізе рэгістрацыі дагавораў. Парадкавая нумарацыя кнігі і дакументаў пры гэтым павінна быць непарыўнай.

Аднак мяняць што-небудзь у дзейнасці пасля папярэджання ў «Вікторыі», відавочна, не збіраліся. Больш за тое, падчас праверкі скаргі Валерыя высветлілася, што ў розных людзей, якія звярнуліся ў агенцтва па дапамогу ў пошуку жылля, дагаворы былі пад аднолькавым нумарам — 76.

— Пры гэтым у якасці прадмета дагавора ўказана не аказанне паслуг па найме жылля, а кансультацыйныя паслугі па здзелках з аб'ектамі нерухомасці. Акрамя таго, у дагаворах у якасці прозвішча дырэктара, які падпісаў дакументы, указана асоба, якая дырэктарам не з'яўляецца. Звесткі пра адказных за выкананне дагавора рыэлтараў увогуле адсутнічаюць, — удакладняе Дзіяна Падлеская. — Міністэрства юстыцыі ўпэўнена, што агенцтвы, якія працуюць па перадаплаце, — гэта праблема. Неабходна на заканадаўчым узроўні прадугледзець, каб паслугі па найме жылля аплачваліся толькі пасля таго, калі спажыўцу падбяруць патрэбны аб'ект нерухомасці.

### ВАЖНЫЯ ПАРАДЫ

Спецыяліст Мінюста акрэсліла асноўныя моманты, прытрымліваючыся якіх, кліент будзе здольны адстаяць свае правы і інтарэсы.

**Перш за ўсё неабходна скласці дагавор на аказанне рыэлтарскіх паслуг.** У дакуменце трэба абавязкова прапісаць паслугі, па якія вы звярнуліся, парадак іх аплаты, абавязкі бакоў і іншыя моманты.

— Калі вы, шукаючы жыллё, вырашылі заключыць дагавор на паслугу па прадастаўленні інфармацыі пра аб'екты нерухомасці, то ў дагаворы неабходна дакладна прапісаць патрабаванні да жылля: кватэра або пакой, кошт арэнды і г. д., — раіць Дзіяна Падлеская. — У межах гэтага дакумента агенцтва мусіць даць вам інфармацыю пра здачу ўнаём мената тых аб'ектаў, што адпавядаюць указанаму ў дагаворы апісанню. Пры гэтым звесткі павінны быць выкладзены пісьмова і з'яўляцца дакладнымі. У гэтым выпадку кліент аплачвае толькі атрыманне інфармацыі, да таго моманту, пакуль ён не знайшоў жыллё.

Калі вы баіцеся, што звесткі пра памяшканне вам дадуць недакладныя, можаце заключыць дагавор на паслугу па падборы варыянтаў здзелкі з аб'ектам нерухомасці па найму жылля. У гэтым выпадку рыэлтары прымаюць на сябе абавязак не прадастаўляць вам інфармацыю, а падабраць варыянт маёмасці адпаведна вашаму жаданню. Такая паслуга аплачваецца па факце падбору аб'екта.

Абедзве паслугі, дарэчы, каштуюць аднолькава — пяць базавых велічынь.

**Абавязкова бярыце свой варыянт дагавора.** Нават калі з нейкай прычыны вы скасавалі дагавор — першапачаткова выдадзены вам варыянт застаецца ў вас.

**І патрабуйце выдачы дакумента, які пацвярджае факт аплаты вамі аказанай паслугі.** Агенцтва павінна выдаць вам чэк.

**Ірына СІДАРОК.**

Смачная тэма

# БРУЖМЕЛЬ ЦІ БУЯКІ?

## Садаводы расказваюць пра новыя трэнды восеньскіх кірмашоў

**Спецыялізаваны кірмаш «Агравосень» — сапраўдны рай для аматараў-садаводаў. Тут можна набыць саджанцы як традыцыйных, так і новых культур. А паколькі попыт на «зялёную» прадукцыю высокі, сёлета кірмаш будзе доўжыцца амаль да канца кастрычніка — па тры дні на тыдні. Арганізатарам вось ужо пяць гадоў выступае Гродзенскі дзяржаўны аграрны універсітэт, дзе і праходзіць сам кірмаш. Праўда, сказаць, што колькасць удзельнікаў зашкальвала, наўрад ці магчыма. Затое не было недахопу ў асартыменце. У топе — буякі, ажына, бружмель...**



### ... і персікі

Яны сёлета багата ўрадзілі, кажуць садаводы. Таму і попыт на саджанцы з кожным годам расце. Яшчэ некалькі гадоў таму многія з недаверам адносіліся да іх пасадкі — цяпер жа амаль праз аднаго набываюць саджанцы. І хоць кошт даходзіць да 14 рублёў, яны добра разыходзяцца.

Цікаўлюся ў садавода са стажам Віктара Сяргеевіча, якія новыя прапановы ёсць на рынку.

— З'явіліся новыя сарты клубніц, у якіх вага адной ягады дасягае 100 грамаў. Яны вырастаюць да памеру невялікага яблыка, — расказаў садавод. — Такіх сартоў раней не было, яны з'явіліся адносна нядаўна, і мы іх актыўна прасоўваем. Таксама многія цікавяцца вінаградам. Мы прапануем няўкрыўныя сарты.

Ірына мае свой гадавальнік паблізу горада. Яна таксама праводзіць свой маніторынг попыту і адзначае, што гродзенцы любяць эксперыментаваць і не баяцца ўкараняць нешта новае. Напрыклад, цяпер набываюць папулярнасць ягадныя культуры — буякі, бружмель, ажыны. Дарэчы, апошнія разабралі за некалькі гадзін. На рынку гэта адна з самых танных культур — як і маліны, прадаюцца ўсяго па 2-3 рублі.

А вось бружмель амаль удвая даражэйшы. Прызнаюся, гэтая расліна для мяне асацыюецца з парфумай. Між тым бружмель пладаносіць ягадамі, якія нагадваюць па смаку чарніцы. Яны з'яўляюцца ўжо ў маі, таму могуць забяспечыць арганізм першымі натуральнымі вітамінамі. Садзіць кусты трэба парамі, кажа Ірына.

Новыя культуры заваёўваюць усе больш прыхільнікаў. Вельмі папулярныя цяпер буякі. Ірына дэманструе фота з багатым ураджаем. І ягады вельмі салодкія, дадае яна.

— У Гродзенскім занальным інстытуце раслінаводства гэтай культурай займаюцца з пачатку 90-х гадоў, — тлумачыць Сяргей, сусед Ірыны, — а праз некалькі гадоў пачалі займацца і садаводы-аматары. Народ ягады пакаштаваў, зразумеў, што гэта смачна і карысна. Цяпер шмат хто вырошчвае буякі. Без перабольшання, можна лічыць іх лідарамі продажу.

### Белы наліў ці зізіфус?

А вось на думку Святланы, папулярнасць традыцыйнай ягады не адыходзіць у мінулае. У яе добра разыходзяцца якраз-такі чорныя парэчкі і агрэст, прытым што кошт саджанца складае 4-5 рублёў. Пацыху зніжаецца попыт на глог і айву. Па словах Святланы, некалькі год таму назіралася



нямала прыхільнікаў ягад годжы, але цяпер попыт знізіўся — магчыма, таму, што не ўсюды гэта культура прыжываецца, і калі не ведаць тэхналогіі вырошчвання, добрага ўраджаю не будзе.

Затое можна спадзявацца на вялікую колькасць чырвоных парэчак. Напрыклад, прадпрымальнік Сяргей заўсёды мае іх у асартыменце. Праўда, парэчкі ў яго новага сорту, даўжыня кісці ў іх дасягае 25 сантыметраў. І амаль без кіслінкі.

— Многія шукаюць старыя сарты тых жа яблыкаў — белы наліў, антонаўку, каштэлю, — заўважае Сяргей. — Людзі мараць вярнуць у сады тое, што было некалі ў іх дзяцінстве. А вось у прамысловых масштабах трэба кіравацца іншымі прынцыпамі — устойлівасцю да хвароб, ураджайнасцю.

Апошнім часам назіраецца праблема з грушамі. Аляксей, які прывёз свае саджанцы з Берасцявіцы, расказаў, што многія дрэвы «хварэюць». У чым тут справа? Аказваецца, для груш небяспечны сусед — ядловец, бо на іх зімуе грыбок, які потым перакідваецца на дрэва, і на лісце з'яўляюцца рыжыя плямы знізу. А расліна шырока распаўсюджана на прыватных сядзібах. Таму дрэва трэба абараняць ад такога суседства.

Новай з'явай Аляксей называе высадку чарэшневых садоў. Раней гэта былі ў асноўным адзінкавыя дрэвы. Для сада многія шукаюць невысокія дрэвы з буйнымі пладамі, кошт якіх вагаецца ад 12 да 15 рублёў за саджанец. У некаторых раёнах добра разыходзіцца грэцкі арэх.

Удала рушаць у сядзібы гродзенцаў зізіфус. Слова гэта больш на слыху як касметычны сродак.

— Гэта кітайскі фінік, які можна вырошчваць і ў нас. Ён вельмі салодкі на смак і багаты вітамінамі, а яшчэ каштоўны як лекавая расліна. Культура зімастойкая і даволі перспектыўная, існуе больш за 400 сартоў, — лічыць Аляксей.

А вось попыт на дэкаратыўныя расліны не такі высокі — мо таму, што іх звычайна высаджваюць вясной. І тут ёсць свае навінкі. У іх ліку — кампсісы. Гэта разнавіднасць ліяны з яркімі кветкамі, эфектная і даволі моцная. Паўднёвая культура шырока распаўсюджана на Украіне, а вось у нас толькі заваёўвае палісаднікі. Па словах Віктара Сяргеевіча, яна добра зімуе, не мае схільнасці да хвароб, як, напрыклад, ружы. Увогуле расліны свет даволі разнастайны, і заўсёды можна знайсці штосьці новае, каб упрыгожыць свае сядзібы.

### Дрэвы-калоны

Вырошчванне саджанцаў ягадных кустарнікаў і садовых культур — асноўны від дзейнасці фермерскай гаспадаркі Аляксандра Брукіша. Справу пачыналі яго бацькі, а пасля заканчэння аграрнага ўніверсітэта далучыўся і сын. Цяпер Аляксандр працягвае справу разам з жонкай Кацярынай. Апошнім часам яны займаюцца вырошчваннем дэкаратыўных раслін, у асноўным туй і кустарнікаў для «жывых» платоў.

Суразмоўнік кажа, што ёсць мода на форму раслін. Напрыклад, сёлета многія цікавяцца дрэвамі, якія нагадваюць калону. У іх вузкія кроны: да аднаго метра ў шырыню, а плады растуць амаль што на ствалах. Самі дрэвы невысокія — да 2,5 метра, што дае магчымасць іх шчыльнай пасадкі. Такія дрэвы адрозніваюцца і сваёй цаной. Калі звычайная яблыня ацэньваецца ў сем рублёў, дык калонавідная — у 10.

### Ці хапае кірмашоў?

Як расказаў **памочнік рэктара Гродзенскага аграрнага універсітэта Уладзімір КІСЛЫ**, «Агравосень» — кірмаш традыцыйны, але вузкаспецыялізаваны. Тут можна набыць у асноўным саджанцы і насенне.

— Звычайна мы праводзім кірмашы ў першых дэкадах кастрычніка і красавіка. Кожны ўдзельнік — прафесіянал у сваёй справе і трымае руку на пульсе часу. Ёсць і іншыя фарматы — вінаградны кірмаш і нават кавуновы. Сёлета ён праходзіў з удзелам Гродзенскай гароднінай фабрыкі з дэгустацыяй, — кажа арганізатар.

Віктар Войцік — пастаянны ўдзельнік кірмаша «Агравосень». Ён працуе ў асноўным у інтэрнэце і лічыць, што ў абласным цэнтры магло б быць больш кірмашоў. На рынку таксама складана з месцам, дакладней, з яго памерамі: выдзяляецца крыху больш за метр, і размясціць свае расліны складана.

А між тым наведвальнікаў — натоўпы. Асабліва ў першай палове дня. Такі інтарэс абумоўлены яшчэ і сезонам — ідзе час пасадак. Дарэчы, кірмашовы бум назіраецца паўсюдна ў рэгіёне, у тым ліку ў райцэнтрах і аграгарадках.

— На гэтым рынку таксама вялікая канкурэнцыя, — кажа Уладзімір Кіслы. — У сувязі з гэтым ёсць небяспека трапіць на нядобрасумленнага прадаўца. Былі выпадкі, калі людзі набывалі замест садовага дрэва лясное. У нас такіх казусаў няма, бо кожны садавод нам добра вядомы і пастаянна ўдзельнічае ў кірмашах.

Сезон сельскагаспадарчых кірмашоў толькі пачаўся, да таго ж у розных фарматах. У Гродне «Агравосень-2019» пройдзе ў канцы гэтага і наступнага тыдняў — па тры дні на кожны этап. Так што яшчэ ёсць час пасадзіць дрэва сваёй мары, а потым ласавацца яго пладамі.

**Маргарыта УШКЕВІЧ, фота аўтара.**



**Народны майстар з Валожыншчыны Хрысціна ЛЯМБОВІЧ — выдатны знаўца тэхналогіі ткацтва паясоў «на ніце». Нібы казачныя рознакаляровыя сцяжынкі, бягуць, пераплятаюцца гэтыя паясы, сатканыя ў традыцыйных колерах. Кампазіцыю, утвораную такімі паясамі, майстар назвала таксама па-казачнаму: «Багіня з поля ідзець...»**

Яўгена Пясецкага
Фота слова

*Калі багіня з поля йшла,*
*Прад ёй схіляліся рамонкі,*
*Жаўрук вітаўся песняй звонкай,*
*Вясна для яе цвіла.*

*Багіня са жніва ішла,*
*Глядзелі долу ў стоме вочы,*
*І зіхацеў абрыс жаночы*
*У промнях боскага святла.*

*Да дзетак, да анёлкаў йшла -*
*Ёй шлях зарніцы асвятлялі,*
*І навальніцы прыціхалі*
*Над хатай, дзе яна жыла.*



## Будзь у курсе!

### «Старт» для будучых журналістаў

**Упершыню ў БДУ пад такой назвай пройдзе конкурс дзіцячай журналістыкі.**

Праверыць свае творчае майстэрства запрашаюцца школьнікі, навучэнцы гімназій і каледжаў, юныя прадстаўнікі журналісцкіх клубаў, гурткоў і прэс-цэнтраў. Змаганне арганізавана па чатырох намінацыях: публікацыя ў СМІ, відэа-аўдыясюжэт, блог і фатаграфія. Заяўкі на ўдзел у друкаваным выглядзе, кароткую біяграфію, фота, характарыстыку з месца вучобы, конкурсныя матэрыялы трэба даслаць да 31 студзеня 2020 года на адрас: вул. Кальварыйская, 9, 220004, г. Мінск, «Конкурс дзіцячай журналістыкі». Фота- і відэаработы ў лічбавым фармаце прымаюцца па электроннай пошце: silinatv@bsu.by. З умовамі конкурсу можна азнаёміцца тут — journ.bsu.by.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

# Извещение о проведении аукциона

| | |
|---|---|
| **Организатор аукциона** | ООО «ИПМ-Консалт оценка», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703, оф. 4б |
| **Продавец** | ОАО «Калинковичский мясокомбинат», Гомельская обл., г. Калинковичи, ул. Северная,8 |

**Предмет аукциона**
**Лот № 1**
**Недвижимое имущество, расположенное по адресу: Гомельская обл., Калинковичский р-н, Липовский с/с, аг. Липов, ул. Советская, 26**

| Наименование (назначение) | Общая площадь | Инвентарный номер |
|---|---|---|
| Здание комплексного приемного пункта | 161,4 кв. м | 333/С-24121 |

***Сведения о земельном участке:*** пл. **0.0415 га** предоставлен продавцу на праве постоянного пользования для обслуживания здания комплексного приемного пункта.

**Начальная цена с НДС 20 % – 3 132,01 бел. руб.**

**Лот №2**
**Недвижимое имущество, расположенное по адресу: Гомельская обл., Калинковичский р-н, Липовский с/с, д. Мироненки, ул. Советская**

| Наименование (назначение) | Общая площадь | Инвентарный номер |
|---|---|---|
| Здание столовой | 453,8 кв. м | 333/С-16912 |

***Сведения о земельном участке:*** пл. **0,2308 га** предоставлен продавцу на праве постоянного пользования для обслуживания здания столовой.

Начальная цена с НДС 20 % – 258 697,67 бел. руб.

**Задаток 10 %** от начальной цены предмета электронных торгов в белорусских рублях перечисляется на Р/с BY92BELB30120048350080226000 в ОАО «Банк БелВЭБ», г. Минск, ул. Мясникова, 32; БИК BELBBY2X; УНП 191224638; ОКПО 378531865000, получатель платежа ООО «ИПМ-Консалт оценка»

**Срок подписания договора купли-продажи: 10 (десять) рабочих дней после проведения электронных торгов**

**Условия оплаты предмета аукциона**

Если между продавцом и покупателем (победитель аукциона либо единственный участник аукциона, согласившийся приобрести предмет аукциона по начальной цене, увеличенной на 5 %) в течение срока, установленного для подписания договора купли-продажи, не достигнута договоренность по срокам и о порядке оплаты за предмет аукциона, такая оплата должна быть произведена в течение **30** (тридцати) дней после заключения договора купли-продажи.

Порядок проведения электронных торгов, критерии выявления победителя торгов, порядок оформления участия в торгах и результатов торгов, установлен регламентом электронной торговой площадки «ИПМ-Торги» размещенным по адресу: **www.ipmtorgi.by**

Победитель электронных торгов, либо единственный участник электронных торгов, согласившийся повысить начальную цену предмета электронных торгов на 5 %, обязан возместить затраты на организацию и проведение электронных торгов, а также оплатить Организатору торгов установленное вознаграждение в течение **3 (трех)** рабочих дней после проведения электронных торгов.

**Аукцион состоится 18.11.2019** в 11.00 на ЭТП «ИПМ-Торги» **(www.ipmtorgi.by).**
**Дата и время окончания приема документов (предварительная регистрация): по 15.11.2019** до 17.00 на ЭТП «ИПМ-Торги» **(www.ipmtorgi.by).**

# Извещение о проведении повторных электронных торгов

| | |
|---|---|
| Организатор аукциона / оператор ЭТП: | ООО «ИПМ-Консалт оценка», г. Минск, ул. Мележа, 5, корп. 2, пом. 1703, оф. 4б |
| **Продавец:** | ООО «СТИ-Лизинг», 222201, Минская область, Смолевичский район, г. Смолевичи, ул. Грушевская, 25, комн. 2 |
| Адрес ЭТП | **www.ipmtorgi.by** |

Предмет электронных торгов: оборудование и транспорт в составе одного лота

| № лота | Наименование | Инвентарный номер |
|---|---|---|
| 1 | **Труборезная машина с ЧПУ ZPB/PW 680** | 000000040 |
| | **Дробемет для очистки стальных труб GGP 1050** | 000000042 |
| | **Линия сварки в комплекте** | 000000001 |
| | **Линия предварительной изоляции труб D 32-630 в комплекте** | 000000004 |
| | **Линия предварительной изоляции труб D 32-1000 в комплекте** | 000000003 |
| | **Линия предварительной изоляции фасонных изделий в комплекте** | 000000002 |
| | **Дизельный четырехопорный боковой погрузчик BAUMANN HX 50 14 40 ST** | 000000049 |

**Начальная цена лота без НДС 20 % – 531 990,00 бел. руб. (шаг аукциона 26 599,50 бел. руб.)**

**Местонахождение лота:** **г. Смолевичи, ул. Грушевская, 25**

**Порядок ознакомления:** осуществляется в рабочие дни с 9.00 до 16.00. Николай Николаевич, контактный телефон + 375 29 6996437

**Задаток 5 %** от начальной цены предмета электронных торгов в белорусских рублях перечисляется на р/с BY92BELB30120048350080226000 в ОАО «Банк БелВЭБ», г. Минск, ул. Мясникова, 32; БИК BELBBY2X; УНП 191224638; ОКПО 378531865000, получатель платежа ООО «ИПМ-Консалт оценка»

| | |
|---|---|
| Срок подписания договора купли-продажи: | **10** (десять) рабочих дней после электронных торгов. |

**Условия оплаты предмета электронных торгов**

Победитель аукциона либо единственный участник аукциона, согласившийся приобрести предмет аукциона по начальной цене, увеличенной на 5 %, обязан оплатить предмет аукциона в соответствии с договором купли-продажи, но не позднее **30 (тридцати) дней** со дня проведения торгов, если иной срок не установлен собранием (комитетом) кредиторов

**Порядок проведения электронных торгов, критерии выявления победителя торгов, порядок оформления участия в торгах и результатов торгов установлен регламентом электронной торговой площадки «ИПМ-Торги», размещенным по адресу: www.ipmtorgi.by**

Победитель электронных торгов либо единственный участник электронных торгов, согласившийся повысить начальную цену предмета электронных торгов на 5 %, обязан возместить организатору торгов затраты на их проведение и оплатить установленное вознаграждение в течение **5 (пяти)** дней после проведения электронных торгов

Организатор электронных торгов имеет право снять предмет аукциона с электронных торгов в любое время до момента определения победителя электронных торгов без объяснения причин снятия

**Дата, время и место проведения электронных торгов: 23.10.2019** в 12.00, на ЭТП «ИПМ-Торги» (**www.ipmtorgi.by**)

**Дата и время окончания приема документов (предварительная регистрация): по 21.10.2019** до 17.00 на ЭТП «ИПМ-Торги» (**www.ipmtorgi.by**)

Контактные телефоны: +375 17-280-36-37; +375 44-704-92-06.
E-mail: auction@cpo.by

# ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО АУКЦИОНА

## *ОАО «Управляющая компания холдинга «ГОРИЗОНТ» проводит повторный открытый аукцион по продаже имущества*

**Повторный аукцион проводится в соответствии с действующим законодательством и Положением ОАО «Управляющая компания холдинга «ГОРИЗОНТ» «О порядке организации и проведения аукционов по продаже капитальных строений (зданий, сооружений), изолированных помещений, машино-мест, их частей»**

| | |
|---|---|
| **ЛОТ № 1** | Капитальное строение с инв. № 500/С-38607, расположенное по адресу: г. Минск, ул. Бабушкина, 60/2. Площадь – 1606 кв. м. Наименование – производственно-складской корпус № 1. Назначение – здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ. Составные части и принадлежности: проезд (Литер а), площадка (Литер б, в, г), подпорная стенка (Литер д), бордюр 0,16 (Литер е), ограждение (Литер ж, и). Обременение: аренда. Внутриплощадочный ж/дор. путь (Колядичи)<br>Земельный участок с кадастровым номером 500000000004005933 площадью 0,6288 га, предоставлен продавцу на праве постоянного пользования, срок действия: не установлен.<br>На земельном участке установлены следующие ограничения:<br>ограничения (обременения) прав на земельные участки, расположенные в охранных зонах линий связи и радиофикации, площадь 0,0136 га; ограничения (обременения) прав на земельные участки, расположенные в охранных зонах электрических сетей, площадь 0,0100 га; ограничения (обременения) прав на земельные участки, расположенные в охранных зонах сетей и сооружений водоснабжения, площадь 0,1300 га; ограничения (обременения) прав на земельные участки, расположенные в охранных зонах сетей и сооружений канализации, площадь 0,2070 га; ограничения (обременения) прав на земельные участки, расположенные в охранных зонах сетей и сооружений теплоснабжения, площадь 0,0310 га |
| **Начальная цена (в т. ч. НДС 20 %), BYN** | **1 034 909,43** |
| **Задаток, BYN** | **103 490,94** |
| **Шаг аукциона** | 5 % |
| **ЛОТ № 2** | Капитальное строение с инв. № 500/С-38608, расположенное по адресу: г. Минск, ул. Бабушкина, 60. Площадь – 6672 кв. м. Наименование – здание специализированное складов. Назначение – здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ. Составные части и принадлежности: проезд (Литер а), дорожка (Литер б, в), площадка (Литер г, д, е, ж, и, к), бордюр 0,08 (Литер л), бордюр 0,16 (Литер м), ограждение (Литер н, п), ворота (Литер р).<br>Обременение: аренда, ипотека. Продавец обязуется снять обременение ипотекой до момента государственной регистрации договора купли-продажи с покупателем.<br>Капитальное строение с инв. № 500/С-38611, расположенное по адресу: г. Минск, ул. Бабушкина, 60/1. Площадь – 11,5 кв. м. Наименование – контрольно-пропускной пункт. Назначение – здание неустановленного назначения.<br>Гараж кирпичный (Колядичи); внутриплощадочный ж/дор. путь (Колядичи); электроподстанция 2КТП-400/1; лифт грузовой грузоподъемностью 3,2 тонны; лифт грузовой грузоподъемностью 3,2 тонны; передаточные устройства (Колядичи); Передаточные устройства (Колядичи); грязеотстойники и бензомаслоупак. (Колядичи).<br>Земельный участок с кадастровым номером 500000000004005934 площадью 1,0714 га, предоставлен продавцу на праве постоянного пользования. Срок действия: не установлен.<br>На земельном участке установлены следующие ограничения:<br>ограничения (обременения) прав на земельные участки, расположенные в охранных зонах линий связи и радиофикации, площадь 0,0272 га; ограничения (обременения) прав на земельные участки, расположенные в охранных зонах электрических сетей, площадь 0,0506 га; Ограничения (обременения) прав на земельные участки, расположенные в охранных зонах сетей и сооружений водоснабжения, площадь 0,1640 га; ограничения (обременения) прав на земельные участки, расположенные в охранных зонах сетей и сооружений канализации, площадь 0,2864 га; ограничения (обременения) прав на земельные участки, расположенные в охранных зонах сетей и сооружений теплоснабжения, площадь 0,0400 га |
| **Начальная цена (в т. ч. НДС 20 %), BYN** | **3 988 567,40** |
| **Задаток, BYN** | **398 856,74** |
| **Шаг аукциона** | 5 % |
| **ЛОТ № 3** | Капитальное строение с инв. № 500/С-38609, расположенное по адресу: г. Минск, ул. Бабушкина, 60/3. Площадь – 1063 кв. м. Наименование – склад ядохимикатов. Назначение – здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ. Составные части и принадлежности: проезд (Литер а, б), площадка (Литер в, г, д, е, ж), бордюр 0,16 (Литер и), ограждение (Литер к, л), ворота (Литер м, н). Обременение: аренда.<br>Капитальное строение с инв. № 500/С-38610, расположенное по адресу: г. Минск, ул. Бабушкина, 60/4. Площадь – 1292,5 кв. м. Наименование – здание склада. Назначение – здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ. Обременение: аренда.<br>Капитальное строение с инв. № 500/С-38612, расположенное по адресу: г. Минск, ул. Бабушкина, 60/5. Площадь – 8 кв. м. Наименование – контрольно-пропускной пункт. Назначение – здание неустановленного назначения. Обременение: аренда. навес металлический (Колядичи); металлический склад (Колядичи); внутриплощадочный ж/дор. путь (Колядичи); кран-балка (грузоподъемностью 1 т, Бабушкина, 60); кран-балка (грузоподъемностью 2 т, Бабушкина, 60).<br>Земельный участок с кадастровым номером 500000000004005935 площадью 2,3197 га, предоставлен продавцу на праве постоянного пользования. Срок действия: не установлен.<br>На земельном участке установлены следующие ограничения:<br>ограничения (обременения) прав на земельные участки, расположенные в охранных зонах электрических сетей, площадь 0,0326 га; ограничения (обременения) прав на земельные участки, расположенные в охранных зонах сетей и сооружений водоснабжения, площадь 0,6892 га; ограничения (обременения) прав на земельные участки, расположенные в охранных зонах сетей и сооружений канализации, площадь 0,3700 га |
| **Начальная цена (в т. ч. НДС 20%), BYN** | **1 258 349,82** |
| **Задаток, BYN** | **125 834,98** |
| **Шаг аукциона** | 5 % |
| **Сведения об организаторе торгов, его местонахождение и контактные телефоны** | ОАО «Управляющая компания холдинга «ГОРИЗОНТ»<br>220029, г. Минск, ул. Куйбышева, 35, пом. 1,<br>тел.: 8 017 284 94 32, факс 8 017 286 76 80. |
| **Сведения о продавце, его местонахождение и контактные телефоны** | ОАО «Управляющая компания холдинга «ГОРИЗОНТ»<br>220029, г. Минск, ул. Куйбышева, 35, пом. 1,<br>тел.: 8 017 284 94 32, факс 8 017 286 76 80. |
| **Сведения о представителях Продавца для осмотра / ознакомления с предметом аукциона** | Ведущий специалист по маркетингу ОАО «Управляющая компания холдинга «ГОРИЗОНТ»<br>Попова Екатерина Владимировна, + 375 17 284 94 32 |
| **Срок подписания договора купли-продажи** | Договор купли-продажи должен быть заключен в течение **10 (десяти) календарных дней** со дня утверждения протокола о результатах аукциона |
| **Возмещение затрат на организацию и проведение аукциона** | Победитель повторного аукциона или единственный участник повторного аукциона, согласившийся приобрести предмет аукциона по начальной цене, увеличенной на 5 %, в течение **5 (пяти) календарных дней** со дня утверждения протокола о результатах повторного аукциона обязан возместить организатору аукциона затраты на его организацию и проведение на основании счета, выставленного организатором аукциона |
| **Условия оплаты** | Оплата задатка производится резидентами в белорусских рублях на следующие банковские реквизиты: р/с BY78 AKBB 3012 0000 3263 3510 0000 в ОАО «АСБ Беларусбанк», код код AKBBBY2X, г. Минск, ул. Куйбышева, 18. Получатель – Открытое акционерное общество «Управляющая компания холдинга «ГОРИЗОНТ». УНН 101059240 ОКПО 37392696. Оплата задатка производится нерезидентами в белорусских рублях или в долларах США по курсу НБ РБ на дату оплаты на следующие банковские реквизиты: В белорусских рублях: р/с BY78 AKBB 3012 0000 3263 3510 0000 в ОАО «АСБ Беларусбанк», код код AKBBBY2X, г. Минск, ул. Куйбышева, 18. Получатель – Открытое акционерное общество «Управляющая компания холдинга «ГОРИЗОНТ». УНН 101059240, ОКПО 37392696. Если между продавцом и покупателем в течение срока, установленного для заключения договора купли-продажи, не достигнута договоренность по срокам и порядку оплаты объекта, оплата стоимости имущества должна быть произведена в течение 30 (тридцати) календарных дней со дня утверждения протокола о результатах аукциона |
| **Место, дата и время приема заявлений на участие в повторном аукционе** | Заявления на участие в повторном аукционе и необходимые документы принимаются **до 14 октября 2019 (включительно)** в рабочие дни с 9.00 до 17.00 по адресу: г. Минск, ул. Куйбышева, д. 35 |
| **Место, дата и время проведения повторного аукциона** | Повторный аукцион состоится **18 октября 2019 года** в 12.00 по адресу: г. Минск, ул.Куйбышева, д. 35,<br>зал совещаний ОАО «Управляющая компания холдинга «ГОРИЗОНТ». |

Организатор повторного аукциона после опубликования извещения о его проведении вправе в любое время без объяснения причин, но не позднее чем за 3 календарных дня до даты проведения повторного аукциона, указанной в извещении о проведении повторного аукциона, отказаться от его проведения

Порядок проведения повторного аукциона и оформления участия в торгах регламентирован Положением ОАО «Управляющая компания холдинга «ГОРИЗОНТ» «О порядке организации и проведения аукционов по продаже капитальных строений (зданий, сооружений), изолированных помещений, машино-мест, их частей»

**Дополнительная информация по тел. + 375 17 284 94 32.**
**E-mail: arenda@horizont.bn.by**

# ИЗВЕЩЕНИЕ о проведении аукциона

ОАО «Автопромторгагросервис» проводит открытый аукцион по продаже:
**Лот № 1: станок токарно-винторезный 1К62Д, инв. № 1528, заводской № 2837.**
**Начальная цена с НДС (20 %) – 6250 бел. руб. Задаток – 1 % от начальной цены (62,5 бел. руб.).**
**Лот № 2: станок круглошлифовальный 3В423, инв. № 1591, заводской № 3518.**
**Начальная цена с НДС (20 %) – 11 760 бел. руб. Задаток – 1 % от начальной цены (117,6 руб.).**
**Станки находятся в г. Марьина Горка, Шацкое шоссе, УП «Пуховичский автотехсервис». Тел.: (801713) 3-57-84, (8-025)-522-84-89.**
**Задатки перечисляются на р/с № BY94BPSB30121047090189330000 в Региональной дирекции № 700 ОАО «БПС-Сбербанк», г. Минск, ул. Машерова, 80, БИК BPSBBY2X, УНН 600050952, ОКПО 28879442.**
Договор купли-продажи должен быть подписан в течение 5 (пяти) рабочих дней после проведения аукциона. Оплата за объект производится в течение 10 (десяти) банковских дней со дня заключения договора купли-продажи, если иное не предусмотрено договором купли-продажи. Победитель аукциона (единственный участник аукциона) возмещает затраты на организацию и проведение аукциона. Порядок проведения аукциона и оформления участия в торгах оговорен в условиях его проведения, доступных по запросу на **aptas@inbox.ru**, либо по адресу: г. Минск, ул. Будславская, 19, каб. 303, 305. Аукцион состоится **20.11.2019 г.** в **10.00** по адресу: г. Минск, ул. Будславская, 19.
Заявления на участие и необходимые документы принимаются по **19.11.2019 г.** до **10.00** по указанному адресу. **Тел.: (8017) 289-85-55, (8-033) 697-72-49.**

Гісторыя і сучаснасць

# ІНТЭРАКТЫЎ НА СЛУЖБЕ Ў ДАЎНІНЫ

## Адным з мерапрыемстваў IV Нацыянальнага форуму «Музеі Беларусі» стала прэзентацыя абноўленай экспазіцыі музея «Бярэсце»

**Больш за 120 музеяў Беларусі разгарнулі свае выстаўкі ў Брэсцкім лёгкаатлетычным манежы, дзе ў мінулыя выхадныя прайшоў чацвёрты форум музеяў краіны. Самыя розныя экспазіцыі, пачынаючы ад сівой даўніны і да нашых дзён, прадставілі розныя мясцовасці і розныя этапы жыцця продкаў і сучаснікаў. Зброя і ваенныя падзеі, народная творчасць, дасягненні адукацыі, навукі, тэхнікі — кожны з наведвальнікаў знаходзіў для сябе нешта цікавае. Тут жа праходзілі і майстар-класы: можна было паспрабаваць сябе ў ролі фехтавальшчыка, навучыцца заварваць адмысловы травяны чай альбо дакрануцца да мастацтва нашых прабабуль у справе вышыўкі і ткацтва.**




— Сучасны музей становіцца мультыкультурным цэнтрам. Ён перастаў быць месцам, дзе проста захоўваюцца духоўныя каштоўнасці. Музей робіць акцэнт на інавацыі, каб стаць цікавым нават для дзяцей, — адзначыла на адкрыцці форуму **першы намеснік міністра культуры Наталля КАРЧЭЎСКАЯ.**

Сапраўды, ад музеяў і іх прапаноў вочы разбягаліся. А тое, што ў самым пачатку наведвальнікаў сустрэў робат-гід Міроша, распрацаваны ў Брэсцкім тэхнічным універсітэце, сведчыла, што сучасны музей нават інтэрактыўная ўстанова.

Каб пазнаёміцца з творчасцю Шагала і Малевіча, аказваецца, не абавязкова ехаць у Віцебск. Дзякуючы мультымедыйным аб'ектам і сэнсарным экранам, гэта можна было зрабіць і ў Брэсце. Экспазіцыю прэзентаваў Віцебскі цэнтр сучаснага мастацтва. А музей гісторыі Віцебскага народнага мастацкага вучылішча нават прапаноўваў набыць аксесуары, выраблены ў стылі авангардызму.

Нямала экспазіцый было прысвечана Вялікай Айчыннай вайне: партызанская зямлянка і лясная школа, падпольная друкарня з урочышча Хаваншчына пад Івацэвічамі — знаёмілі з жыццём і побытам партызанскіх атрадаў.

А вось вядомы нават за межамі нашай краіны музей народнай творчасці «Бездзежскі фартушок» пакарыў не інтэрактывам, а найперш аўтэнтыкай. Гэтыя яркія фартухі з вясёлым малюнкам, што выйшлі з-пад іголак драгічынскіх вышывальшчыц, здольныя ўзняць настрой кожнаму, хто на іх глядзіць. Месяц таму давялося назіраць, як спыняліся каля выстаўкі фартушкоў падчас святкавання тысячагоддзя Брэста замежныя госці. Сапраўды, нават у самым разнастайным горадзе майстроў абмінуць гэтую стракатую прыгажосць немагчыма.

Многія музеі прадстаўлялі эпоху сярэднявечча. Але ж найважнейшай падзеяй форуму можна, відаць, назваць прэзентацыю абноўленай экспазіцыі археалагічнага комплексу «Бярэсце». Яго нездарма называюць каралём усіх музеяў. Бо, напрыклад, у тысячагадовым Брэсце няма нічога старэйшага за квартал жылых і гаспадарчых пабудоў XIII стагоддзя. Таму можна сказаць, што адсюль



пішацца гісторыя горада. Яшчэ варта нагадаць, што гэта адзіны ў Еўропе музей сярэднявечнага ўсходнеславянскага горада XI—XIII стагоддзяў. Падчас раскопак пад кіраўніцтвам Пятра Лысенкі, якія вяліся з 1969 года на плошчы 1800 квадратных метраў, знайшлі дзясяткі драўляных пабудоў, якія добра захаваліся. Адкапалі нават вулічныя маставыя, агароджы, шматлікія прадметы матэрыяльнай культуры. Над гэтым раскопам, які складае аснову экспазіцыі музея, узвялі спецыяльны павільён з бетону, шкла і алюмінію памерам 40х60 метраў.

Музей «Бярэсце» быў адчынены ў 1982 годзе. З той пары яго наведала больш за тры мільёны чалавек. Зразумела, што праз столькі гадоў паўстала пытанне аб абнаўленні аб'екта. Першая чарга капітальнага рамонту завяршылася яшчэ ў 2017 годзе. Тады шмат зрабілі ў плане мадэрнізацыі. Напрыклад, замянілі шкляныя вітражы фасадаў, з'явіліся новая сістэма вентыляцыі, падсветка. Апошнія два гады ішоў працэс рээкспазіцыі.

На службу музейным работнікам прыйшлі інтэрактыўныя тэхналогіі: цяпер тут паспяхова суіснуюць новае і старое. Галоўны ж экспанат — археалагічны раскоп на глыбіні чатырох метраў — застаецца нязменным. А вось іншыя памяшканні паступова мяняюцца. Залы-нішы, аформленыя ў стылі «хай-тэк», ацанілі не ўсе наведвальнікі, асабліва старэйшага пакалення. На што **дырэктар музея Святлана ШЧЭРБА** па-філасофску заўважыла: «Мы цяжка расстаёмся са звыклым. А вось моладзі падабаецца. Розлічваем на іх як на патэнцыйных наведвальнікаў».

І сапраўды, у фондах музея захоўваецца 43 тысячы прадметаў. Вядома, усе выставіць немагчыма, але ж новая экспазіцыя папоўнілася матэрыяламі, якіх раней не было і якія пашыраюць уяўленне пра побыт берасцян, эканамічны і культурны складнікі горада той пары. У адной з залаў музея ўладкавана жытло гараджаніна тых часоў, там будуць праводзіць музейныя заняткі.

Вядома, асаблівая ўвага аддаецца ўнікальным экспанатам, знойдзеным падчас раскопак. Менавіта гэтыя знаходкі сталі доказамі, што дазволілі паставіць кропку ў навуковых спрэчках. У 1980 годзе на міжнародным кангрэсе па славянскай археалогіі Пётр Фёдаравіч Лысенка абверг гіпотэзу польскіх гісторыкаў пра тое, што Брэст заснавалі польскія плямёны. Першым аргументам сталі пацеркі са срэбнымі шарыкамі ўнутры, якія вырабляла толькі адно племя — дрыгавічы, другім — свінцовая падпісная пячатка тураўскага князя. І галоўным доказам выступіў самшытавы грэбень з кірыліцай, старажытны буквар. Як вядома, палякі кірыліцай не карысталіся. Усё гэта цяпер расказваюць наведвальнікам пры дапамозе сучасных сродкаў, якімі сталі інтэрактыўныя пляцоўкі з QR-кодамі, інсталяцыямі, элементамі відыявізуалізацыі. А яшчэ экскурсантаў сустракаюць аб'ёмныя раставыя фігуры майстроў, рамеснікаў, жыхароў горада за штодзённымі клопатамі. Гэта спрые стварэнню эфекту прысутнасці. Сапраўды, з маладым пакаленнем наведвальнікаў трэба гаварыць на іх мове. Яны прыходзяць, счытваюць смартфонам QR-код і атрымліваюць усю цікавую ім інфармацыю.

**Святлана ЯСКЕВІЧ.**
**Фота Аляксандра ШУЛЬГАЧА.**

Спорт-тайм

# З перспектывай на Токіа

**У штотыднёвым спартыўным аглядзе «Звязды» расказваем пра найбольш актуальныя навіны выхадных.**

1. **Беларускія батутысты заваявалі дзве ўзнагароды на этапе Кубка свету, які завяршыўся ў Вальядалідзе (Іспанія).** Старт меў кваліфікацыйны статус да Алімпійскіх гульняў у Токіа і сабраў 300 спартсменаў з 37 краін.

«Золата» ў самым прэстыжным відзе праграмы, індывідуальных скачках, выйграў Уладзіслаў Ганчароў. У сінхронных скачках «бронзу» заваявалі беларусы Іван Літвіновіч і Мікіта Фомчанка, для якога гэта быў дэбют на этапах Кубка свету. Апярэдзіць іх змаглі толькі канкурэнты з Канады і Японіі.

2. **Беларуская зборная па лёгкай атлетыцы засталася без медалёў на чэмпіянаце свету, які завяршыўся ў Досе.** У ачковай класіфікацыі беларусы размясціліся на 15-й пазіцыі, на рахунку нашай каманды 25 ачкоў. Чацвёртае месца заняў Максім Недасекаў (скачкі ў вышыню). Пятыя месцы на рахунку марафонкі Вольгі Мазуронак і Анастасіі Міронччык-Івановай (скачкі ў даўжыню). На шостым радку выніковага пратакола сусветна чэмпіянат завяршылі Карына Дзямідзік (скачкі ў вышыню), Алёна Дубіцкая (штурханне ядра), Тацццяна Халадовіч (кіданне дзіды). Сёмае месца ў Ірыны Жук (скачкі з шастом). Восьмае месца ў кіданні молата заняў Глеб Дудараў.



Тройку наймацнейшых дружын планетарнага першынства склалі каманды ЗША (14 залатых, 11 сярэбраных, 4 бронзавыя медалі), Кеніі (5-2-4) і Ямайкі (3-5-3).

3. **Анастасія Алістратава заваявала алімпійскую ліцэнзію на чэмпіянаце свету па спартыўнай гімнастыцы, які праходзіць у нямецкім Штутгарце.** Старты жанчын у кваліфікацыі індывідуальнага мнагаборства сабралі 174 спартсменкі. Анастасія па суме чатырох практыкаванняў заняла 57-е месца. Такім чынам, беларуска трапіла ў лік 20 гімнастак, якія выканалі кваліфікацыйны нарматыў, што дае права выступіць на Гульнях-2020 у Токіа. Прахадной стала ацэнка 50,066 бала, пры гэтым не ўлічваліся вынікі гімнастак, якія занялі 12 першых месцаў у камандным заліку, таксама ў адборы было абмежаванне — не больш за адну спартсменку ад краіны.

4. **Завяршыўся 24-ы тур чэмпіянату краіны па футболе.** «Дынама» згуляла ўнічыю з «Іслаччу» — 1:1, «Энергетык-БДУ» перайграў «Віцебск» — 2:0, «Гомель» і «Дняпро» згулялі ўнічыю — 0:0. Вынікі астатніх сустрэч: «Гарадзея» — «Мінск» — 1:2, «Слуцк» — БАТЭ — 0:3, «Шахцёр» — «Тарпеда-БелАЗ» — 3:0, «Нёман» — «Дынама (Брэст) — 0:1.

Становішча ў групе лідараў: «Дынама» (Брэст) — 58 ачкоў (23 матчы), «Шахцёр» — 54 (23), БАТЭ — 53 (22), «Дынама» (Мінск) — 45 (23), «Тарпеда-БелАЗ» — 41 (24). Спіс найлепшых бамбардзіраў узначальвае Ілля Шкурын («Энергетык-БДУ»), які забіў 14 мячоў.

5. **Хакеісты мінскага «Дынама» прайгралі ў трэцім матчы дамашняй серыі чэмпіянату КХЛ казанскаму «Ак Барсу» — 2:4.** Раней на «Мінск-Арэ-



не» супраць «Сочы» і чэлябінскага «Трактара» хакеісты мінскага «Дынама» атрымалі перамогі. Да гэтага ў гасцях пацярпелі тры паражэнні ад ніжагародскага «Тарпеда», чарапавецкай «Северсталі» і ніжнекамскага «Нафтахіміка». Наступны матч мінчане правядуць у гасцях у рыжскага «Дынама» 9 кастрычніка.

**Дар'я ЛАБАЖЭВІЧ.**

# Напісанае застаецца: новае выданне твораў Васіля Быкава

**Выдавецтва «Мастацкая літаратура» распачало новую кніжную серыю — «Напісанае застаецца». Першая кніга ў творчым праекце, які абяцае выклікаць увагу чытачоў, — зборнік аповесцяў народнага пісьменніка Беларусі Васіля Быкава «Знак бяды. Абеліск. Жураўліны крык».**

Тыраж выдання, якім адкрылася серыя, — 1200 паасобнікаў. Ужо цяпер кнігу можна набыць у кнігарнях ААТ «Белкніга» па ўсёй нашай краіне, а таксама праз інтэрнэт-гандаль гэтай жа гандлёвай сеткі. Заўважым, што выпуск зборніка ажыццёўлены па заказе і пры фінансавай падтрымцы Міністэрства інфармацыі Рэспублікі Беларусь. Тытульны аркуш выдання ўпрыгожвае рэпрадукцыя аўталітаграфіі Юрася Герасіменкі-Жызнеўскага да аповесці Быкава «Знак бяды» (твор выкананы ў 1984 годзе).

— Мяркуем, што кожны год серыя будзе папаўняцца на чатыры-шэсць кніг, — кажа **дырэктар выдавецтва «Мастацкая літаратура» Алесь БАДАК.** — Вось літаральна днямі прыйдзе з друкарні і кніга прозы нашага класіка Якуба Коласа. Так з часам кожны, хто пажадае, збярэ свой беларускі кнігазбор.

*— А чые кнігі ў серыі «Напісанае застаецца» збіраецеся выдаць у найбліжэйшы час?*

— Менавіта тых пісьменнікаў, чые творы вытрымалі выпрабаванне часам: Іван Мележ, Уладзімір Караткевіч, Янка Сіпакоў, Міхась Стральцоў, Вячаслаў Адамчык... Пералік можна доўжыць. Думаю, што і чытачы нам нешта падкажуць. Вельмі спадзяюся на меркаванні бібліятэкараў у праектаванні серыі «Напісанае застаецца». Тады, магчыма, і тыражы кніг у гэтым выдавецкім праекце павялічым.

**Мікола БЕРЛЕЖ.**

Слова эксперту

# РАЗГАДАЦЬ «КОД ШАГАЛА»

**ДОКТАР філалогіі, літаратуразнаўца з Вільнюса Мардэхай Юшкоўскі, спецыяліст па мове ідыш, за некалькі хвілін можа растлумачыць, чаму славуты ўраджэнец Віцебска Марк Шагал пісаў тое, што, напэўна, большасці незразумела. Напрыклад, закаханых у небе, жывёл за сталом побач з людзьмі, старога з жоўтым тварам...**



«Шагал жа быў рэалістам! Яго родная мова — ідыш. І ён думаў, гаварыў, пісаў на ёй. Мала хто ведае, што ён складаў вершы, і вельмі добрыя! Справа ў тым, што Марк Шагал у пераносным сэнсе маляваў на гэтай мове. Як даследчык скажу, што мастак адлюстроўваў тое, што прынята называць прымаўкамі, народнай мудрасцю, жартамі», — упэўнена даказвае эксперт.

Ён чытае лекцыі ў многіх краінах. Пра «Шагала — рэаліста», у прыватнасці, ужо чулі тысячы людзей у Ізраілі, Украіне, Расіі, Грузіі... У Беларусі — упершыню!

Мардэхай Юшкоўскі, акадэмічны дырэктар міжнароднага Цэнтра мовы і культуры ідыш пры Сусветным яўрэйскім кангрэсе ў Вільнюсе спецыяльна прыехаў у Беларусь з Ізраіля, каб прачытаць лекцыю «Марк Шагал. Мастак, які маляваў на ідыш». Ён выступіў у музеі Марка Шагала, а потым зноў паляцеў у Ізраіль, бо даты яго лекцый распісаны далёка наперад.

**Дырэктар віцебскага шагалаўскага музея Ірына ВОРАНАВА** канстатавала, што для Віцебска прыезд эксперта — вялікія гонар і ўдача, а для гараджан — магчымасць раскрыць для сябе Шагала наноў.

Спадар Юшкоўскі так нетрадыцыйна экспрэсіўна для вучоных яго ўзроўню апавядаў пра Шагала, яўрэйскія традыцыі, мястэчкі, што слухачы рэагавалі бурна. Сярод іншага замежны госць спяваў, пародзіраваў яўрэяў з мястэчка, чытаў вершы...

— Вось незразумела, бадай, амаль усім: чаму закаханых Шагал маляваў не як усе, а на небе. Проста ў ідыш ёсць выраз у розных формах, як, дарэчы, і ў рускай мове: «Ад шчасця лётаць хочацца!» Вось і маляваў закаханых над Віцебскам, — разважае лектар.

Пра лятаючых кароў таксама, на думку Юшкоўскага, усё зразумела. Калі па-руску хтосьці апавядае нешта, скажам так, малаверагоднае, яму кажуць: хопіць бабуліных казак, небыліц. На ідыш пра тое самае скажуць прыкладна так: «Карова лётала — вы пра гэта?» Вось Шагал і маляваў — тое, што чуў ад сваякоў, сяброў, на вуліцы! Літаральна так.

— А твар старога зялёнага колеру з жоўтай барадой на адной з карцін? Дык у нас кажуць, што чалавек ад бед, хвароб ды перажыванняў пазеляне́ў! Як і пра твар, які пачарнеў. Усё лагічна... Як і каза белага колеру — частый персанаж твораў, сімвал чысціні. На адным з палотнаў — каза каля немаўляці, хіба тут нешта трэба тлумачыць? — разважае спадар доктар.

Юшкоўскі нагадвае: славутая аўтабіяграфічная кніга Марка Шагала «Маё жыццё» ў арыгінале напісана на ідыш. Але ў перакладзе на іншыя мовы чамусьці знікае яго падзагаловак пра яўрэйскага хлопчыка з Віцебска. А ў гэтым і ёсць «ключ да кода Шагала!» Бо ў дзяцінстве мастак жыў у правінцыйным гарадку, гаварыў на ідыш. Таму і маляваў тое, што чуў, бачыў, адчуваў навокал... Жыццё яўрэйскага мястэчка «пашагалаўску» — адлюстраванне рэальнасці. І нават калі ўзяць выяву чалавека, які «стаіць на галаве», — гэта не проста фантазія, а перадача выказвання пра тое, што свет перакульваецца.

— Чаму ў творах Шагала дзяўчына не глядзіць на свайго мужчыну? «Ён ёй закруціў галаву, ды так, што яна стала як заваражаная!» — прыкладна так можна перакласці з ідыш словы пра жанчыну, якая вельмі закахалася, — працягвае даследчык. — Ён сам пісаў, што бачыць свет праз яўрэйскія прымаўкі.

Мардэхай Юшкоўскі прызнаўся, што сам нечакана для сябе «адкрыў Шагала праз ідыш». І вельмі рады, што яго асабістае адчуванне мастака атрымлівае такое разуменне і падтрымку ў іншых людзей, каму цікава разабрацца ў шагалаўскай таямніцы.

І калі задумацца, знайсці логіку ў каранях, знаках, зразумець Шагала будзе вельмі проста.

Родная мова — гэта вялікая сіла. Дзе б чалавек ні жыў, хай нават амаль забыў пэўныя словы і выразы, мова ўсё роўна ўплывае на яго характар, звычкі, успрыманне свету. Таму, як упэўнены літаратуразнаўца, Шагал менавіта такі, якім мы яго ведаем, бо гаварыў, пісаў, маляваў на ідыш!

**Аляксандр ПУКШАНСКІ.**
**Фота аўтара.**

# МІНУЛАЕ — ДЛЯ СУЧАСНІКАЎ

## Рассакрэчаныя дакументы сведчаць...

**У Беларускім дзяржаўным музеі гісторыі Вялікай Айчыннай вайны праходзіць часовая фотадакументальная экспазіцыя «1939. Пачатак Другой сусветнай вайны».**

**Вы не знойдзеце тут «разжаванай» інфармацыі, але ўбачыце архіўныя дакументы, вывучаючы якія можна самому зрабіць высновы пра падзеі, што адбываліся ў 1939 годзе. Вы даведаецеся, якія пазіцыі займалі тыя ці іншыя кіраўнікі, што за рашэнні прымалі, як вырашаліся лёсы краін, і нават паспрабуеце знайсці адказы на пытанні, ці магчыма было прадухіліць Другую сусветную і ці ўсё было для гэтага зроблена. На многіх з прадстаўленых на выстаўцы дакументах пазначана «строга сакрэтна», але ў наш час яны сталі даступныя для даследчыкаў.**

Фотадакументальная экспазіцыя створана Беларускім дзяржаўным музеем гісторыі Вялікай Айчыннай вайны сумесна з Прадстаўніцтвам Рассупрацоўніцтва ў Рэспубліцы Беларусь. Экспазіцыя грунтуецца на дакументальных матэрыялах з Архіва знешняй палітыкі Расійскай Федэрацыі, якія ахопліваюць перыяд з сакавіка да жніўня 1939 года і адлюстроўваюць узаемаадносіны Савецкага Саюза з Германіяй, Польшчай, Японіяй, Англіяй і Францыяй. Раней гэтыя дакументы ў такім маштабе ў нашай краіне прадстаўлены не былі. А сённяшнія высокаякасныя электронныя копіі дазваляюць убачыць нават заўвагі, якія рабілі кіраўнікі ў бок складальнікаў дакументаў, і тыя адзнакі, што пакідаліся на палях.



Дакументы даюць магчымасць па месяцах прасачыць, як развіваліся падзеі. Прадмовай для экспазіцыі яе стваральнікі абралі словы з выступлення Сталіна 10 сакавіка 1939 года на XVIII з'ездзе партыі са «Справаздачным дакладам аб рабоце ЦК ВКП(б)», калі ён заўважыў: «Ужо другі год ідзе новая імперыялістычная вайна, якая разыгралася на велізарнай тэрыторыі ад Шанхая да Гібралтара і захапіла больш за 500 мільёнаў насельніцтва. Гвалтоўна перакройваецца карта Еўропы, Афрыкі, Азіі. Узрушана ў корані ўся сістэма пасляваеннага так званага мірнага рэжыму... Вось пералік найважнейшых падзей за справаздачны перыяд, якія паклалі пачатак імперыялістычнай вайне. У 1935 годзе Італія напала на Абісінію і захапіла яе. Летам 1936 года Германія і Італія арганізавалі ваенную інтэрвенцыю ў Іспаніі. Прычым Германія зацвердзілася на поўначы Іспаніі і ў іспанскім Марока, а Італія — на поўдні Іспаніі і на Балеарскіх астравах. У 1937 годзе Японія пасля захопу Маньчжурыі ўварвалася ў Паўночны і Цэнтральны Кітай, заняла Пекін, Цяньцзін, Шанхай і стала выцясняць з зоны акупацыі сваіх замежных канкурэнтаў. У пачатку 1938 года Германія захапіла Аўстрыю, а восенню 1938 года — Судэцкую вобласць Чэхаславакіі. У канцы 1938 года Японія захапіла Кантон, а ў пачатку 1939 года — востраў Хайнань.

Характэрная рыса новай імперыялістычнай вайны складаецца ў тым, што яна не стала яшчэ ўсеагульнай, сусветнай вайной...»

Да пачатку Другой сусветнай тады заставалася каля паўгода.

Дакументы сведчаць: сярод прычын, якія прывялі да катастрофы, — недасканаласць створанай пасля Першай сусветнай вайны Версальскай сістэмы, якая паставіла Германію ў адасобленае становішча. Паўплываў і сусветны фінансава-эканамічны крызіс 1929—1933 гадоў, які закрануў вядучыя краіны Захаду. Не было зроблена нічога, каб спыніць нацызм, агрэсіўную сутнасць якога не разглядзелі ці не хацелі заўважаць заходнія лідары і таму не супрацьстаялі захопніцкім планам Германіі, Італіі і Японіі.

Выстаўка адкрываецца экспазіцыяй дзвюх нот, якімі абмяняліся знешнепалітычныя ведамствы Германіі і Савецкага Саюза па чэхаславацкім пытанні. Нямецкі бок пастфактум паведамляў, што 15 сакавіка 1939 года германскія войскі перайшлі чэхаславацкую мяжу і што прэзідэнт Гаха «перадае лёс чэшскага народа і краіны ў рукі фюрара германскай дзяржавы». У савецкай ноце ў адказ было заяўлена аб немагчымасці прызнання ўключэння Чэхіі ў склад Германскай імперыі. СССР аказаўся адзінай краінай, якая выступіла супраць агрэсіі Германіі.

Улічыўшы рост пагрозы для краін Усходняй і Паўднёва-Усходняй Еўропы, у сакавіку наркам замежных спраў Літвінаў разаслаў тэлеграмы сваім паўнамоцным прадстаўнікам у Францыі і Англіі з тым, каб было ініцыявана пасяджэнне ці канферэнцыя па бяспецы з удзелам зацікаўленых бакоў. СССР бачыў, якая небяспека пагражае Румыніі, і гатовы быў прыйсці на дапамогу. Аднак яго прапанова не была прынята.



Дакументы паказваюць, што перамовы з Англіяй і Францыяй у 1939 годзе больш нагадвалі «працэс дзеля працэсу» . Між тым падзеі развіваліся імгненна. Мы можам убачыць тэлеграму наркаму замежных спраў Вячаславу Молатаву ад часовага паверанага ў справах СССР у Даніі, дзе той паведамляе пра заключэнне пакта аб ненападзенні паміж Даніяй і Германіяй. Як вядома, гэты пакт Данію ад акупацыі не выратаваў. У экспазіцыі можна ўбачыць артыкул члена Палітбюро Жданава з красамоўным загалоўкам «Англійскі і французскі ўрады не хочуць роўнага дагавора з Савецкім Саюзам», ліст часовага паверанага ў справах СССР Астахава, дзе ён з трывогай піша пра блізкасць канфлікту, які наспявае паміж Германіяй і Польшчай. Германскі бок не саромеецца ў перапісы казаць пра тое, што польскае пытанне будзе вырашана любой цаной. Прадстаўлена на стэндах і перапіска паміж Сталіным і Гітлерам, дзе яны абмяркоўваюць пытанні будучага дагавора аб ненападзенні, а таксама сам дагавор і сакрэтны пратакол да яго, ёсць і фатаграфія, якая зафіксавала гістарычны момант падпісання дагавора. Таксама тут змешчаны дакументы, якія паказваюць, якія перагаворы Савецкі Саюз вёў з Японіяй, тэлеграма ваеннага аташэ пры паўнамоцным прадстаўніцтве СССР у Польшчы Рыбалка і паўнамоцнага прадстаўніка СССР у Польшчы Шаронава аб нападзенні Германіі на Польшчу, датаваная 1 верасня 1939 года.

**Алена ДЗЯДЗЮЛЯ.**

Кніжная вандроўка

# ТАЯМНІЦЫ ПАЛЕСКАЙ ЗЯМЛІ

**Нядаўна ў выдавецтве «Беларусь» выйшаў у свет своеасаблівы навукова-папулярны даведнік пра незвычайны палескі горад — «Тураў: старажытны і сучасны». Яго аўтарам стаў пісьменнік, публіцыст і даследчык гісторыі Юрый Кур'яновіч.**


Каменны крыж, які вырастае з зямлі на Барысаглебскіх могілках. Май 2019 года.

Каб прыцягнуць належную ўвагу грамадскасці да праблемы занепаду Турава, Юрый Кур'яновіч запрашаў і працягвае запрашаць туды ў прыватным парадку і славутых людзей, і вядомых літаратараў, і радыёстанцыі, і тэлебачанне. Падчас карпатлівай працы над кнігай разам з аўтарам горад наведвалі такія няўрымслівыя, творчыя людзі, як член саюзаў пісьменнікаў Беларусі і Расіі паэтка Валянціна Паліканіна, паэты-барды Валерый Пазнякевіч і Эдуард Акулін, паэт Леанід Драньbig-Майсюк, кінадраматург, сцэнарыст і паэт Уладзімір Мароз, паэт і публіцыст Алесь Гібок-Гібкоўскі, даследчык гісторыі і культуры, кнігазнавец Валерый Герасімаў, паэт-перакладчык Генадзь Бардышаў. Удзельнікам некаторых памятных сустрэч быў і аўтар гэтых радкоў. Адбываліся яны ў мясцовых доме культуры і бібліятэцы. Пісьменнік не пераставаў падкрэсліваць, што ён улюбёны ў Тураў. І таму, як толькі выпадала вольная хвіліна, ён лёцьма ляцеў у мястэчка.

У свой час у краязнаўчым музеі і тураўскіх школах прайшла фотавыстаўка пісьменніка пад назвай «Краявіды беларускай Палесціны», якая адлюстравала філасофскую непаўторнасць нашай Бацькаўшчыны. Сярод іншых можна было ўбачыць здымкі выраслага крыжа на Барысаглебскіх могілках і драўлянай капліцы, на месцы якой пабудавалі новую, з белай цэглы. Гэтыя фатаграфіі ўвайшлі, вядома ж, і ў багата ілюстраваную кніжку.

Як вядома, на мове геаметрыі зямная прастора мае тры вымярэнні — даўжыню, шырыню і вышыню. У такой сістэме каардынат мы і ўспрымаем, і асэнсоўваем наваколле, адзначае аўтар. А вось уявіць сабе чацвёртае вымярэнне — гэта як сляпому ад нараджэння думаць пра фарбы. У гэтым чацвёртым вымярэнні прадстаўнікі розных рэлігійных культаў знайшлі месца таямнічым, звышнатуральным з'явам. У гэты загадкавы свет Юрый Кур'яновіч і здзейсніў сваё «падарожжа», якое стала займальнай экскурсіяй у гісторыю краіны і спазнаннем багатай культурнай спадчыны з яе язычніцкімі і біблейскімі матывамі — матывамі, вельмі характэрнымі для старажытнай Тураўшчыны. Сапраўды, можа, менавіта тут і знаходзіцца каўчэг напаўнення і захавання народнай міфалогіі, ментальнасці і феномена нашай адметнай і незвычайнай культуры?

Каб заінтрыгаваць чытача, непасрэдны аповед аўтар кнігі пачынае з таго месца, дзе б'ецца сэрца палескага краю. Гэта поўдзень краіны, паэтычнае ўзбярэжжа неўтаймавана-наравістай Прыпяці. Тут, сярод балотных капішчаў, старажытных славянскіх паселішчаў і рэштак першых хрысціянскіх храмаў, і «прапісаўся» легендарны Тураў — рэліктавая скарбонка беларускай этнаграфіі.

Нават сёння, падкрэслівае аўтар, гэтая зямля для многіх нашых суайчыннікаў — terra incognita. Першыя рысы яе міфалагічнасці яскрава вымалёўваюцца, калі пераязджаеш прыпяцкі мост па шашы ад Жыткавіч да Турава. Перад вачыма паўстае карціна велічнай ракі, аблямаванай зялёнай стужкай адвечных лясоў. Гледзячы на гэты неруш, нібы перагортваеш старонкі памяці, вяртаешся ў часы панавання продкаў — дрыгавічоў і драўлян. Можа, гэта сюды прыводзіў драўлянскі князь Мал сваіх дзяцей — прыгажуню Малушу і дужага Дабрыню, каб яны атрымалі першае бацькоўскае настаўленне і разуменне такіх рэчаў, як свабода, незалежнасць і любоў да сваёй Радзімы? А ці не перадала потым яго дачка па крыві свайму сыну Уладзіміру Вялікаму, хрысціцелю рускай зямлі, гэты незалежніцкі, свабодалюбны дух, а дзядзька-выхавацель Дабрыня — ваяўнічы пыл?

Так, пагаджаюся з аўтарам: за смугой часу нам не даведацца пра дзявочыя мары дачкі драўлянскага князя Малушы, пра падрабязнасці яе стасункаў са сваім мужам — князем Святаславам Ігаравічам. Прыпяцкая зямля маўкліва захоўвае праўду пра тыя падзеі, пра авеяны легендамі і славай Тураў. Прыемнага ўсім знаёмства з яе таямніцамі...

**Уладзімір БАРЫСЕНКА.**
**Фота Юрыя КУР'ЯНОВІЧА.**


Царква Усіх Святых 1802 года. Сакавік 2009 года.

Радзімазнаўства

# Вядомыя людзі з Капыльшчыны

**Выдавец Зміцер Колас выпусціў у свет цікавы і змястоўны зборнік біяграфічных нарысаў доктара філалагічных навук Алеся Бельскага «Тут наша радзіма».**

Дасведчаны літаратуразнаўца, Алесь Іванавіч Бельскі болей вядомы як гісторык беларускай літаратуры, як літаратурны крытык, як празаік са сваім поглядам на жыццё. Шмат гадоў ён выкладае ў Беларускім дзяржаўным універсітэце. Часта выступае ў перыядычным друку з грунтоўнымі літаратуразнаўчымі артыкуламі, нарысамі і рэцэнзіямі, прысвечанымі сучаснаму літаратурнаму працэсу ў Беларусі. Але ж доктар філалагічных навук — яшчэ і руплівы краязнавец, стваральнік біяграфіі Капыльскага краю, адкуль ён сам родам. Адна з новых кніг Алеся Бельскага — «Тут наша радзіма: вядомыя людзі з Капыльшчыны ў Беларусі і свеце». У зборнік біяграфій вядомых дзеячаў навукі, эканомікі і культуры з Капыльшчыны, якія вызначыліся сваім талентам і майстэрствам, творчай працай і прафесійнымі дасягненнямі, ёсць цудоўнае і трапяткое прысвячэнне: «Бацькам, родным Цімкавічам і Капылю прысвячаю».

Ці не на самым пачатку кнігі Бельскі цытуе нарыс зямлячкі — публіцысткі Марыі Карпенкі: «Не выказаць словамі безліч пачуццяў, успамінаў, роздуму пра тую кропку зямлі, якая звычайна завецца малой радзімай. Хто сказаў — малая? Для мяне яна — найвялікшая. Услед за сваім славутым земляком Кузьмой Чорным я паўтараю: «Родныя мае мясціны. Як мая душа рвецца туды! Яна заўсёды там...» Там — гэта на Капыльшчыне, у Цімкавічах і навакольных паселішчах, дзе ўсё-ўсё маё, пачынаючы ад старой бярозы на «кацярынінскім» шляху і канчаючы магіламі продкаў, бацькі і мужа».

Не будзем пералічваць вялікіх і славутых землякоў, якім прысвечаны зборнік Алеся Бельскага. Дзеля гэтага варта перагарнуць старонкі кнігі «Тут наша радзіма» — літаральна на кожнай з іх вас чакаюць цікавыя сустрэчы. Не прамініце, пашукайце гэта выданне ў кнігарнях і бібліятэках. Зробленае доктарам філалагічных навук Алесем Бельскім — цудоўны ўнёсак у пашырэнне прасторы Года малой радзімы. І яшчэ — напамін для іншых літаратараў, каб звярнуцца да апісання сваіх родных мясцін.

**Мікола БЕРЛЕЖ.**

Пантэон Айчыны

# ВАСІЛЬ ВАШЧЫЛА

*(1690—1744)*

У савецкай беларускай гістарыяграфіі імя Васіля Вашчылы стала сімвалам барацьбы беларускіх сялян за свабоду. Ён узначаліў найбуйнейшае ў Беларусі XVIII стагоддзя сялянскае паўстанне. Вобраз Вашчылы натхніў Уладзіміра Караткевіча, і, як вынік, з'явілася п'еса «Маці ўрагану», паводле якой быў зняты і аднайменны фільм. Пры ўсёй гераізацыі вобраза Вашчылы прызнаем, што ён быў чалавек мужны, харызматычны і вельмі разумны. Сапраўды, узначаліць паўстанне (а за ім пайшлі не толькі сяляне, але і мяшчане, і нават шляхта) і не дапусціць яго перараўтварэння ў стыхійны, жорсткі бунт, трымаць дысцыпліну сярод паўстанцаў — для гэтага трэба валодаць і арганізатарскім талентам, і маральным аўтарытэтам, і мужнасцю паднясца супраць мацнейшага ворага.

Крычаўскае паўстанне само па сабе ўнікальнае, бо не мае аналагаў у беларускай гісторыі, яно было не супраць несправядлівага сацыяльнага ладу, а супраць канкрэтных асоб — драпежных арандатараў князя Гераніма Радзівіла. Як уладальнік Крычаўскага староства ён перадаў тое прагным да нажывы арандатарам, якія ўводзілі на сваю карысць новыя падаткі і павіннасці. Даведзеныя да галечы сяляне скардзіліся Радзівілу: «Адкуль нам, няшчасным, узяць, калі мы з цяжкасцю можам пракарміць нашы душы? Мы ўжо маем шмат пазык, адны на невыносныя падаткі, іншыя на хлеб, таму што нам забаранілі яго мець, заўсёды не толькі з хлява, але праз гумны забіралі ў нас арандатары, арэндныя ўтрымальнікі ды іх слугі». Але ён заставаўся глухі да скаргаў сялян, якіх не лічыў за людзей, яшчэ часцей хадакі трапляні ў рукі арандатараў і неслі цяжкую кару. Двойчы хадаком да Радзівіла сяляне выбіралі Васіля, селяніна з вёскі Селішча (яго сапраўднае прозвішча замяніла дзіцячая мянушка Вашчыла). Першы раз ён хадзіў ажно ў далёкую Варшаву, і пасля вяртання быў схоплены слугамі галоўнага арандатара староства Гдаля Іцкавіча і пакараны 150 ударамі бізуна. Вашчыла выжыў. Другі раз, ужо ў 1731 годзе, яго злавілі дарогай і кінулі ў ланцугах у Крычаўскую турму.

Прыгнёт з боку арандатараў і іх прыслужнікаў узрастаў, яны адчувалі сябе беспакаранымі. Аднак усяму ёсць мяжа. Вясной 1740 года сяляне вёскі Панкі спалілі дом аднаго з арандатараў. За гэта да смяротнай кары прысудзілі 18 чалавек. На абарону іх падняласа ўся валасць, і сваім правадыром паўстанцы выбралі Вашчылу. Яны вызвалілі арыштаваных. Вашчыла на чале ўзброенага атрада пачаў усталёўваць справядлівасць: ён забараніў адміністрацыі гнаць сялян на прымусовую работу на лясных будах, а калі забароны былі парушаны, паўстанцы спалілі дзве буды. Але «на сваіх паноў ніякага ўмыслу не меў», — сведчыў Вашчыла. Ён хацеў утрымаць паўстанцаў у рамках закону. Геранім Радзівіл патрабаваў жорсткага падаўлення паўстання, бачачы ў гэтым «нешта небывалае», — «граміць і належна караць свавольных». Мясцовыя ўлады кінулі на паўстанцаў усе наяўныя сілы. Каля Хоцімска ўрадавы атрад разбіў частку паўстанцаў і шмат каго з іх захапіў у палон. У адказ паўстанне шуганула ва ўсім старостве.

Адміністрацыя прасіла Радзівіла прыслаць яго асабістыя войскі (ён меў каля шасці тысяч жаўнераў), бо ў старостве «сапраўдная казачына — нельга паказацца ў вёсках». Замест войска той прыслаў новага галоўнага арандатара, які быў не лепшы за папярэдніка і больш за тое, прыступіў да праверкі зямель, каб павысіць падатак. Тут ужо ўзбунтавалася шляхта, якая падбівала сваіх сялян на паўстанне. Напрыклад, ушацкі староста Крыштаф Валовіч падбадзёрваў паўстанцаў: «Трымайцеся, не паддавайцеся», хіславіцкі староста Марцін Цеханавецкі ўвогуле прыслаў атрад у 300 чалавек. Паўстанцы разбілі ўрадавыя сілы і па сутнасці захапілі ўладу ў старостве. Сведка тых падзей пісаў: «Быў пасля таго гэты Вашчыла сам у гэтым горадзе (Крычаве. — **Аўт.**) і павеце ўпраўцелем некаторы час, збіраючы з сялян патрэбныя падаткі па ранейшым звычаі на князя». Вашчыла здаваў у арэнду корчмы, буды, млыны, забараніў арандатарам прыцясняць сялян і патрабаваў належным чынам аплачваць іх працу. Багацеі плацілі адмысловы падатак, які ішоў на дапамогу беднякам.

Услед за Крычаўскім староствам на барацьбу падняліся сяляне Віцебскага і Аршанскага паветаў. Па вёсках і мястэчках хадзіла пагалоска, што Вашчыла — унук Багдана Хмяльніцкага. Цяпер ужо захваляваліся цэнтральныя ўлады і рушылі на паўстанцаў атрад на чале з мінскім стольнікам Валадковічам. Але той, прыйшоўшы ў Крычаў, нібыта трапіў у пастку — усе дарогі з горада занялі паўстанцы.

На ўсмірэнне паўстанцаў Геранім Радзівіл паслаў сваё прыватнае войска. 18 студзеня 1744 года ў бітве каля Крычава паўстанцы пацярпелі паражэнне. Усе палонныя (77 паўстанцаў) былі забіты. Вашчыла адвёў ацалелыя сілы за Сож і ў вёсцы Царкоўшчына пачаў збіраць новае войска. Сабралася каля чатырох тысяч чалавек. Але і кіраўнік урадавых войскаў палкоўнік Пястжэцкі папоўніў свае шэрагі прысланай Радзівілам дапамогай. Ён не стаў выпрабоўваць лёс у бітве з паўстанцамі, а 26 студзеня ранкам нечакана напаў на іх лагер. Знішчальны агонь са стрэльбаў і гармат пасеяў паніку, загінула 200 чалавек і 176 трапіла ў палон — іх жорстка пакаралі смерцю.

Васіль Вашчыла ўцёк у Расію. Яго адправілі для следства ў Кіеў. Вашчыла выдаваў сябе за ўраджэнца вёскі Чамаданава Старадубскага палка, значыць, падданага Расійскай імперыі. Улады выпісалі яму пашпарт і хацелі ўжо адпусціць, як у Кіеў прыйшоў ліст Радзівіла, у якім пісалася, што Вашчыла, «собрав несколько десят тысяч (!) своевольных людей, дворы, местечки и деревни господ шляхтичей Мстиславского воеводства ограбил и более тысячи людей умертвил». Пачалося новае следства. Вашчыла абвяргаў абвінавачванні: сяляне самі паўсталі, не забіваў, не рабаваў, «ні капейкі са староства не ўзяў». Яго адправілі ў Старабуд пад следства змешанай расійска-радзівілаўскай камісіі. Тут, у Старадубскай турме, захварэўшы на дызентэрыю, Вашчыла 18 жніўня памёр, нягледзячы на ўсе намаганні дактароў — магчыма, выбраў смерць, каб не трапіць у рукі радзівілаўскіх катаў і застацца свабодным.

**Вітаўт ЧАРОПКА.**

# ЗАО Банк ВТБ (Беларусь)

Республика Беларусь, 220007, г. Минск, ул. Московская, 14
Тел.: (+375 17) 309 15 15, (+375 29) 309 15 15, (+375 33) 309 15 15

## Бухгалтерский баланс на 1 октября 2019 г.

*(в тысячах белорусских рублей)*

| № п/п | Наименование статьи | Символ | 2019 год | 2018 год |
|---|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 |
| 1 | АКТИВЫ | | | |
| 2 | Денежные средства | 1101 | 37 926 | 33 626 |
| 3 | Драгоценные металлы и драгоценные камни | 1102 | - | - |
| 4 | Средства в Национальном банке | 1103 | 156 898 | 255 558 |
| 5 | Средства в банках | 1104 | 47 811 | 90 104 |
| 6 | Ценные бумаги | 1105 | 299 539 | 217 819 |
| 7 | Кредиты клиентам | 1106 | 873 302 | 831 839 |
| 8 | Производные финансовые активы | 1107 | 463 | 5 |
| 9 | Долгосрочные финансовые вложения | 1108 | 2 297 | 1 897 |
| 10 | Основные средства и нематериальные активы | 1109 | 54 620 | 43 528 |
| 11 | Доходные вложения в материальные активы | 1110 | - | 1 569 |
| 12 | Имущество, предназначенное для продажи | 1111 | 3 341 | 849 |
| 13 | Отложенные налоговые активы | 1112 | - | 408 |
| 14 | Прочие активы | 1113 | 16 147 | 17 754 |
| 15 | ИТОГО активы | 11 | 1 492 344 | 1 494 956 |
| 16 | ОБЯЗАТЕЛЬСТВА | | | |
| 17 | Средства Национального банка | 1201 | - | 4 |
| 18 | Средства банков | 1202 | 52 368 | 330 697 |
| 19 | Средства клиентов | 1203 | 1 147 618 | 913 320 |
| 20 | Ценные бумаги банка | 1204 | 10 613 | 168 |
| 21 | Производные финансовые обязательства | 1205 | 33 | - |
| 22 | Отложенные налоговые обязательства | 1206 | - | - |
| 23 | Прочие обязательства | 1207 | 28 349 | 23 482 |
| 24 | ВСЕГО обязательства | 120 | 1 238 981 | 1 267 671 |
| 25 | СОБСТВЕННЫЙ КАПИТАЛ | | | |
| 26 | Уставный фонд | 1211 | 117 562 | 117 562 |
| 27 | Эмиссионный доход | 1212 | 3 432 | 3 432 |
| 28 | Резервный фонд | 1213 | 12 252 | 10 074 |
| 29 | Фонды переоценки статей баланса | 1214 | 31 942 | 32 061 |
| 30 | Накопленная прибыль | 1215 | 88 175 | 64 156 |
| 31 | ВСЕГО собственный капитал | 121 | 253 363 | 227 285 |
| 32 | ИТОГО обязательства и собственный капитал | 12 | 1 492 344 | 1 494 956 |

## Отчет о прибылях и убытках на 1 октября 2019 г.

*(в тысячах белорусских рублей)*

| № п/п | Наименование статьи | Символ | 2019 год | 2018 год |
|---|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 |
| 1 | Процентные доходы | 2011 | 88 532 | 78 540 |
| 2 | Процентные расходы | 2012 | 43 415 | 32 076 |
| 3 | Чистые процентные доходы | 201 | 45 117 | 46 464 |
| 4 | Комиссионные доходы | 2021 | 53 496 | 41 527 |
| 5 | Комиссионные расходы | 2022 | 4 788 | 3 776 |
| 6 | Чистые комиссионные доходы | 202 | 48 708 | 37 751 |
| 7 | Чистый доход по операциям с драгоценными металлами и драгоценными камнями | 203 | - | - |
| 8 | Чистый доход по операциям с ценными бумагами | 204 | 252 | 66 |
| 9 | Чистый доход по операциям с иностранной валютой | 205 | 6 008 | 11 462 |
| 10 | Чистый доход по операциям с производными финансовыми инструментами | 206 | (3 621) | (2 853) |
| 11 | Чистые отчисления в резервы | 207 | 10 352 | 1 081 |
| 12 | Прочие доходы | 208 | 3 472 | 8 090 |
| 13 | Операционные расходы | 209 | 54 181 | 53 476 |
| 14 | Прочие расходы | 210 | 2 469 | 1 774 |
| 15 | Прибыль (убыток) до налогообложения | 211 | 32 934 | 44 649 |
| 16 | Расход (доход) по налогу на прибыль | 212 | 6 752 | 11 022 |
| 17 | ПРИБЫЛЬ (УБЫТОК) | 2 | 26 182 | 33 627 |

Председатель Правления С. В. Суслопаров

Главный бухгалтер М. В. Дудко

Дата подписания: 3 октября 2019 г.

**Финансовая отчетность на 1 октября 2019 г. в полном объеме размещена на сайте банка по адресу: www.vtb-bank.by**

УНП 101165625

## РУП «Институт недвижимости и оценки» извещает о проведении повторного открытого аукциона по продаже недвижимого имущества ОАО «Нерудпром»

**Лот № 1**: КПП с инв. № 600/С-161457, площадь – 18,2 кв. м, 2002 г. п. Адрес: Минский р-н, Петришковский с/с, 10/4, район д. Захаричи. Начальная цена с НДС – 11 184,00 бел. руб. Задаток – 2 000,00 бел. руб. Земельный участок с кадастровым номером 623685700001000370 площадью 0,1287 га. Право аренды (по 18.07.2049).

**Лот № 2**: Гараж с инв. № 600/С-161460, площадь – 67,5 кв. м, 1995 г. п. Адрес: Минский р-н, Петришковский с/с, 10/5, район д. Захаричи. Начальная цена с НДС – 21 116,00 бел. руб. Задаток – 3 000,00 бел. руб. Земельный участок с кадастровым номером 623685700001000371 площадью 0,2439 га. Право аренды (по 18.07.2049).

**Лот № 3**: Склад строительных материалов с инв. № 600/С-161456, площадь – 70,3 кв. м, 1967 г. п. Адрес: Минский р-н, Петришковский с/с, 10/3, район д. Захаричи. Начальная цена с НДС – 11 930,00 бел. руб. Задаток – 2 000,00 бел. руб. Земельный участок с кадастровым номером 623685700001000372 площадью 0,1546 га. Право аренды (по 18.07.2049).

Переход прав на земельные участки осуществляется в соответствии с действующим законодательством Республики Беларусь

**Аукцион состоится 28.10.2019 в 11.00 по адресу: г. Минск, ул. Комсомольская, д. 11, 3-й этаж, каб. 4. Шаг аукциона – 5 %**

Порядок оформления участия в аукционе, условия участия в аукционе, срок заключения договора купли-продажи, условия оплаты, а также полный текст извещения содержатся на сайте Организатора аукциона ino.by.

Продавец: ОАО «Нерудпром», г. Минск, ул. Асаналиева, 72, тел. 8 (017) 365-66-07. Организатор аукциона: РУП «Институт недвижимости и оценки», 220030, г. Минск, ул. Комсомольская, 11, пом. 9.

Задаток перечисляется на р/с BY21BPSB30121543370109330000 в ОАО «БПС-Сбербанк», г. Минск, БИК BPSBBY2X. Получатель – РУП «Институт недвижимости и оценки», УНП 190055182. Назначение платежа: задаток для участия в аукционе 28.10.2019 (ОАО «Нерудпром», Лот №__). Заявления на участие и необходимые документы принимаются в рабочие дни с 8.30 до 12.00, с 13.30 до 16.00 по адресу: г. Минск, ул. Комсомольская, 11, каб. 7. Окончание приема заявлений – 25.10.2019 в 11.00. Участник, желающий участвовать в аукционе в отношении нескольких лотов, вносит задатки в размере, установленном для каждого из лотов. Первое, полное извещение о проведении аукциона опубликовано в газете «Звязда» от 15.08.2019

**☎ Организатор аукциона: 8 (017) 324-70-57, 8 (029) 356-90-03, 8 (029) 550-09-52 • www.ino.by • e-mail: torgi@ino.by**

## ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО АУКЦИОНА ПО ПРОДАЖЕ ИМУЩЕСТВА ОАО «БРЕСТОБУВЬТОРГ»

**Предмет торгов – Лот:**

1) Изолированное помещение с инвентарным номером 100/D-70453 (наименование: помещение склада; назначение: складское помещение), площадью 547,9 кв. м, расположенное по адресу: Брестская обл., г. Брест, ул. Я. Купалы, д. 100;
2) Изолированное помещение с инвентарным номером 100/D-70454 (наименование: помещение склада; назначение: складское помещение), площадью 15,4 кв. м, расположенное по адресу: Брестская обл., г. Брест, ул. Я. Купалы, д. 100;
3) Комплект стеллажного оборудования, инвентарный номер 1067;
4) Электропогрузчик TOYOTA 7FBEST15, инвентарный номер 1101.

| Начальная цена, руб. (без учета НДС) | 214 062,70 | Размер задатка, руб. | 21 406,27 |
|---|---|---|---|

**Продавец:** ОАО «Брестобувьторг» г. Брест, ул. Я. Купалы, 100, УНН 200019574. **Условия продажи:** без условий. **Организатор аукциона:** Брестский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки». **Реквизиты для перечисления задатка:** р/с BY76BPSB30121789380179330000 в ОАО «БПС-Сбербанк» Региональная дирекция № 100 по Брестской области, BIC Банка BPSBBY2X, УНП 201028245. **Срок заключения договора купли-продажи:** в течение 20 рабочих дней с момента подписания протокола о результатах аукциона. **Условия оплаты:** в соответствии с заключенным договором купли-продажи

**Аукцион состоится 23 октября 2019 г. в 11.00 по адресу: г. Брест, ул. Наганова, 10-325**

**Сведения о документах, которые необходимо представить для участия в аукционе, можно узнать у организатора аукциона по телефонам: 8-(0162)-20-92-13, 21-88-81, 8-(029) 626-72-52**

**Заявления на участие в аукционе принимаются по адресу: г. Брест, ул. Наганова, 10, 329 в рабочие дни с 9.00 до 17.00**

**Последний день приема заявлений – 22 октября 2019 г. до 17.00**

*** Участник аукциона, выигравший торги, оплачивает продавцу НДС в размере 20 % от продажной стоимости объекта, вознаграждение Организатору аукциона**

*** Ранее извещение о продаже имущества ОАО «Брестобувьторг» опубликовано в газете «Звязда» от 14.08.2019**

## ИНФОРМАЦИЯ

МГ УКП «Центр по приватизации» сообщает, что **на аукционе, назначенном на 14 октября 2019 года,** по продаже недвижимого имущества, принадлежащего **ОАО «Строительный трест № 17 ордена Трудового Красного Знамени», снимается с торгов лот № 1 –** Изолированное помещение с инвентарным номером 700/D-136736 общей площадью 206,5 кв. м, расположенное по адресу: Могилевская обл., г. Могилев, б-р Непокоренных, 28-8.

Справки по тел.: 42-25-64, 8-029-15-15-444. УНП 700008710

## ОАО «Гомельоблреклама» филиал «Эксперт-Услуга» (организатор аукциона) по поручению Гомельского филиала РУП почтовой связи «Белпочта» (продавец имущества) извещает о проведении 23 октября 2019 года открытого повторного аукциона по продаже имущества со снижением начальной цены на 50 % в 11.00 в городе Гомеле по улице Гагарина, 20

| № лота | Наименование предметов торгов | Начальная цена продажи имущества, с учетом НДС (20 %), бел. руб. | Сумма задатка, с учетом НДС (20 %), бел. руб. |
|---|---|---|---|
| | **Местонахождение лотов:** г. Гомель, проспект Речицкий, 9А | | |
| 2 | **Автомобиль ВАЗ 21070**, **2006** г. в., рег. знак **5744 АР 3**, инв. № 504160002, цвет – синий, тип ТС – грузовой специальный седан, состояние – неудовлетворительное, на ходу | **294,39** | 29,44 |
| 4 | **Автомобиль УАЗ 390902**, **2006** г. в., рег. знак **АА 3862-3**, инв. № 504000019, цвет – голубой, тип ТС – грузопассажирский вагон, состояние – неудовлетворительное, на ходу | **582,90** | 58,29 |
| 5 | **Автомобиль УАЗ 3909**, г. в. не определен, рег. знак **ЕМ 4421**, инв. № 50022, цвет – голубой, тип ТС – грузопассажирский фургон, состояние – неудовлетворительное, на ходу | **569,53** | 56,95 |

**Продавец:** Гомельский филиал РУП почтовой связи «Белпочта», г. Гомель, ул. Советская, 8. **Порядок ознакомления с имуществом осуществляется по контактному тел.:** начальник транспортного цеха Штанюк Олег Геннадьевич 8 (029) 618-71-04, ведущий инженер по транспорту Шевчук Виктор Валентинович 8 (029) 611-91-28. **Шаг аукционных торгов – 5 %. Для участия в аукционе необходимо: 1)** Оплатить задаток на расчетный счет **Продавца (Гомельский филиал РУП почтовой связи «Белпочта»):** р/с BY35 AKBB 3012 0210 2005 4310 0000, ЦБУ 305 в филиале № 302 ОАО «АСБ Беларусбанк», г. Гомель, ул. Барыкина, 94, BIC AKBBBY 21302, УНП 400395996, ОКПО 28867858, назначение платежа – задаток за участие в аукционных торгах (задаток для участия в аукционе перечисляется до подачи заявления); **2)** Подать заявление организатору аукциона по установленной форме с приложением необходимых документов можно **с 8 октября 2019 г.** по адресу: г. Гомель, ул. Гагарина, 20, 2-й этаж, каб. «Эксперт-Услуга» в рабочие дни с 09.00 до 13.00 и с 14.00 до 16.00 **прием заявлений для участия в аукционе заканчивается 21 октября 2019 г. в 16.00 включительно. Заявления, поступившие после установленного срока, не принимаются. Организатор аукциона вправе отказаться от проведения аукциона в любое время, но не позднее чем за три дня до его проведения.**

**В случае если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в нем подано только единственным участником, объект аукциона продается этому участнику при его согласии по начальной цене, увеличенной на 5 (пять) %.** Участник торгов имеет право до начала торгов письменно отозвать свое заявление на участие. Неявка участника торгов на торги признается отказом от участия в торгах. В этих случаях сумма внесенного им задатка возвращается **Продавцом** в течение **5 (пяти) рабочих дней** со дня проведения торгов. Победителями торгов будут признаны участники, предложившие более высокую цену. Лица, являющиеся победителями торгов, обязаны: подписать протокол о результатах аукциона; заключить договор купли-продажи в течение **5 (пяти) календарных дней** от даты подписания протокола о результатах аукциона; оплатить приобретаемое имущество согласно договору купли-продажи в течение **5 (пяти) календарных дней** и возместить затраты на организацию и проведение аукциона в течение **3 (трех) рабочих дней** с момента подписания протокола. Задатки, уплаченные участниками аукциона, ставшими победителями, будут учтены в счет исполнения обязательств по договору купли-продажи. Проводится аукцион в соответствии с Положением Открытого акционерного общества «Гомельоблреклама» филиал «Эксперт-Услуга» о порядке организации и проведения аукционов по продаже имущества и права на заключение договоров аренды нежилых помещений (их части). **Ранее опубликованное извещение о торгах размещено в газете «Звязда» от 18.07.2019 г. № 133 (29000). Порядок оформления участия в аукционе, в том числе документации, необходимой для регистрации участника торгов, порядок проведения аукциона размещены на официальном сайте Организатора торгов – www.gomeloblreklama.by, раздел «Аукционы». Дополнительная информация по контактным телефонам Организатора торгов: 8 (0232) 23-23-54, 23-23-56, 8 (029) 126-66-62.**

## Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки» извещает о проведении повторного аукциона

ЛОТ № 12: MAZ 9919 ППЦ-22, гос. номер А 0959 В-4 (Полуприцеп специальный – цистерна для перевозки нефтепродуктов, цвет оранжевый, разрешенная масса 29 737 кг, год выпуска – 2008). Начальная цена продажи лота – 2 120,64 руб. (две тысячи сто двадцать рублей шестьдесят четыре копейки) с учетом НДС. Сумма задатка – 212 руб. (двести двенадцать рублей)

Условия проведения аукциона:
– возмещение победителем аукциона (лицом, приравненным к победителю аукциона) затрат Продавца на организацию и проведение аукциона, в том числе затрат по уплате вознаграждения организатору аукциона в размере 5 % от конечной цены продажи объекта;
– 100 % предоплата за приобретаемый объект.
Срок заключения договора купли-продажи – 20 рабочих дней с момента подписания протокола аукциона

Продавец – РУП «Белоруснефть-Гроднооблнефтепродукт», 230005, г. Гродно, ул. Дзержинского, 96, 45-27-03

Организатор торгов – Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки», г. Гродно, ул. Врублевского, д. 3, каб. 209, тел. 55-87-70

Номер р/с для перечисления задатка BY44BLBB30120500833225001001 в Дирекции ОАО «Белинвестбанк» по Гродненской области, код банка BLBBBY2X, УНП 500833225

**Аукцион состоится 22 октября 2019 г. в 11.00 по адресу: Гродненская область, г. Гродно, ул. Врублевского, 3, 209**

Порядок регистрации в качестве участника аукциона и правила проведения аукциона содержатся на сайте организатора аукциона **http://grodnoino.by/aukcion/uchastniku.**

Объявление о проведении первого аукциона было размещено в газете «Звязда» от 17.01.2019 г.

**Заявления на участие в аукционе принимаются по адресу: г. Гродно, ул. Врублевского, 3, каб. 209, с 8.30 до 17.30 (понедельник – четверг) и с 8.30 до 16.30 (пятница). Обед – с 12.30 до 13.18.**

**Последний день приема заявлений – 18 октября 2019 г. до 15.00**

Телефон для справок 55-87-71.
Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки»
http://grodnoino.by/

## Центр Промышленной Оценки

- **Организация аукционов**
- **Оценка всех видов имущества**

# Извещение о проведении повторных электронных торгов

| | |
|---|---|
| **Организатор аукциона** | ЗАО «Центр промышленной оценки», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703, оф. 5. Сайт в интернете: **www.cpo.by** |
| **Продавец** | ОАО «Завод «Легмаш», Витебская обл., г. Орша, пер. Восточный, 17 |
| **Оператор ЭТП** | ООО «ИПМ-Консалт оценка», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703, оф. 4б |
| **Адрес ЭТП** | **www.ipmtorgi.by** |

**Предмет электронных торгов**

| № лота | Наименование | Общая площадь | Инвентарный номер |
|---|---|---|---|
| 1 | Здание корпуса 22 (бытовая часть) (здание административно-хозяйственное) | 6 012 кв. м | 240/С-40051 |

**Местонахождение предмета торгов:** Витебская обл., Оршанский р-н, г. Орша, ул. Якубовского, 69

**Сведения о земельном участке**: участок общ. пл. **0,2634 га** предоставлен продавцу для обслуживания здания корпуса 22 (бытовая часть) на праве аренды до 04.03.2083 г.

| | |
|---|---|
| **Начальная цена с НДС 20 %** | **394 800,00 бел. руб. (снижена на 50 %)** |
| **Шаг электронных торгов** | **19 740,00 бел. руб.** |

**Задаток 10 %** от начальной цены предмета электронных торгов в белорусских рублях (BYN) перечисляется на р/с BY60BLBB30120191021390001001 в Дирекции «ОАО Белинвестбанк» по г. Минску и Минской области (адрес банка: г. Минск, ул. Коллекторная, 11), БИК BLBBBY2X, УНП 191021390, получатель платежа ЗАО «Центр промышленной оценки»

| | |
|---|---|
| Срок подписания договора купли-продажи | **30 (тридцать)** рабочих дней после электронных торгов |

**Условия оплаты предмета электронных торгов**

Если между продавцом и покупателем (победитель электронных торгов либо единственный участник электронных торгов, согласившийся приобрести предмет электронных торгов по начальной цене, увеличенной на 5 %) в течение срока, установленного для подписания договора купли-продажи, не достигнута договоренность по срокам и о порядке оплаты предмета электронных торгов, такая оплата должна быть произведена в течение **30 (тридцати) календарных дней** после заключения договора купли-продажи

**Электронные торги проводятся в соответствии с регламентом электронной торговой площадки «ИПМ-Торги», размещенным по адресу: www.ipmtorgi.by**

Победитель электронных торгов либо единственный участник электронных торгов, согласившийся повысить начальную цену предмета электронных торгов на 5 %, обязан возместить организатору торгов затраты на их проведение и оплатить установленное вознаграждение в течение **3 (трех)** дней после проведения электронных торгов

Организатор электронных торгов имеет право снять предмет аукциона с электронных торгов в любое время до момента определения победителя электронных торгов без объяснения причин снятия

Предыдущее извещение о проведении аукциона опубликовано в газете «Звязда» 21.09.2019 г.

**Дата, время и место проведения электронных торгов: 18.10.2019** в 11.00 на ЭТП **www.ipmtorgi.by**

**Дата и время окончания приема документов (предварительная регистрация): по 17.10.2019** до 17.00 ЭТП **www.ipmtorgi.by**

| | |
|---|---|
| **Контактные телефоны** | **+375 17-280-36-37; +375 44-704-92-06; auction@cpo.by;** |

Жыццёвінкі

# ПЕРАЙСЦІ ПОЛЕ...

## ЗАДАННЕ

У гэтым невялікім рабочым пасёлку некалькі вуліц. На адной з іх жыве Лізавета Пятроўна, а на другой, але гэта значна паводдаль, — яе сын Сцяпан з жонкай і сынам-школьнікам. Маці без года дзевяноста, муж, Аркадзь, даўно памёр, дочкі, а іх у Лізаветы Пятроўны дзве, прыжыліся ў горадзе. Побач — толькі сын. Старой, трэба сказаць, пашанцавала, бо такога сына пашукаць: не адыходзіць ад маці. Кожны дзень забяжыць, пацікавіцца: «Ну, як ты тут?» Хацеў наогул забраць старую да сябе, але тая адмахнулася, заўпарцілася: «Мяне ўжо перасаджваць на новае месца, што старое дрэва. Ці прыжывуся? А тут я ў сябе дома. Крыху поўзаю, і добра. Не крыўдуй, сынку. І ты ж, дзякаваць богу, малайчына — не забываеш. А там дзеўкі мае калі прыедуць з горада, унукі, то такі гамуз будзе — куды там! Ды, відаць, дзяцей заўсёды цягне ў тую хату, дзе яны хадзіць вучыліся, дзе ім усё да драбніц знаёма... А варта не пажыць колькі часу ў сваёй хаціне, яна і адвернецца ад чалавека... будзе глядзець на яго ўжо не так... чужой стане... халоднай...»

Так і жылі маці і сын — на розных вуліцах і ў сваіх хатах. А тут жыццё раптам унесла неспадзяваныя карэктывы: банкрутам прызналі мясцовую фабрыку, метызы нікому сталі не патрэбны, і Сцяпан застаўся без работы. Што рабіць? Як жыць далей? Жонка, праўда, працавала ў дзіцячым садку, але ж на адну яе зарплату доўга не пратягнеш. Лізавета Пятроўна як магла таксама дапамагала грашыма. Але пазней Сцяпану прапанавалі работу вахтавым метадам у лясгасе. Выбару не мелася — трэба было ехаць у лес адразу на некалькі дзён. Перад тым, як адправіцца ў камандзіроўку, ён прыйшоў да маці не адзін — с сынам Сярожам, які вучыўся ў другім класе. І пры ёй сказаў яму:

— Мама, Сярожа, пакуль я знаходжуся ў лесе, будзе заходзіць да цябе кожны раз па дарозе са школы. Што табе трэба — скажаш яму. Ён усё зробіць. Ты ўсё зразумеў, сынуля?

Сярожа бадзёра адказаў:

— Заданне атрымана! Будзе выканана! Едзь спакойна і за нас не хвалюйся. Так, бабуля?

Старая прыгарнула ўнука да сябе, ледзь прыкметна ўсміхнулася:

— Так, унучак, так. Увесь у бацьку...

І суседзі бачылі, як пасля школы Сярожа, раз-пораз папраўляючы на спіне цяжкаваты заплечнік, кожнага дня заходзіў да бабулі...

## ЯГАДЫ

Так атрымалася, што пад старасць, можна сказаць, Марыя зацяжарала трэцім дзіцем. Спярша расхвалявалася, калі даведалася пра гэта, бо год усё ж нямала — трошкі за сорак, што людзі скажуць? А тады махнула рукою, павесялела: «А што мне людзі! — супакойвала сябе жанчына. — Ды, можа, і добра, што так атрымалася — пад старасць памочнік у сям'і будзе. Гэтыя двое, дачка і сын, не сёння-заўтра разляцяцца, пакінуць бацькоўскі дом. Як той казаў, што ні робіцца — усё да лепшага...»

Муж, калі даведаўся, што народзіцца сын, быў, здавалася, на сёмым небе ад шчасця.

— Мне хоць будзе з кім на хакей ды футбол хадзіць! — ледзьве не пляскаў ён у ладкі. — А то Міхася ўпусціў — спярша не браў з сабой, бо, лічыў, малы яшчэ, не дарос, куды яму, а потым той і сам не праяўляў цікаўнасці. Гэтага не ўпушчу!

Пайшоўшы ў дэкрэт, Марыя прыехала ў вёску да маці. Не проста праведаць старую, але і дапамагчы чым зможа па гаспадарцы.

— Сядзі ўжо, дачка, я сама спраўлюся, — ківаючы на жывот, які ўжо добра-такі акругліўся, гаварыла маці. — А то яшчэ што здарыцца, не дай божа!.. У нас тут цяпер ні дактароў, нічога...

— Ты за мяне, мама, не перажывай, — супакойвала Марыя. — Вось заўтра сястра Танька прыедзе, то яшчэ і па ягады сходзім. Бо дужа ж ужо багата дурніц сёлета на нашым балоце!

Маці не адразу адказала Марыі. Крыху счакаўшы, уздыхнула і з сумам у голасе прамовіла:

— Даўно і я на тым балоце не была. Усё няма калі...

Што, мусіць, азначала: а мо і мне з вамі, дзеўкі, выбрацца?

На выхадныя, як і чакалася, прыехала і Танька з дзецьмі — дачкой і сынам. Дзеці амаль дарослыя — старшакласнікі.

— Ну што, па ягады? — паабедаўшы, акінула позіркам гасцей Марыя. — Заўтра? Зранку? Не чую воплескаў!

Яе дружна падтрымалі. Хоць пляменнік і пляменніца пагалядзелі спярша на цяжарную цётку, здзіўлена пераглянуліся: няўжо і яна пойдзе ў такім стане?

Вярнуліся з ягад апоўдні. Крыху натомленыя, але шчаслівыя: посуд, што бралі, кожны напоўніў з каптурком. Але самае большае вядзерца было ў Марыі!

— Здзіўляецеся, бачу? — паглядзела яна на сваякоў, усміхнулася. — А нічога тут дзіўнага няма. Я ж не адна збірала ягады — нас было двое. Улічваць трэба!..

## СОН

Больш за ўсё Марфа Мікалаеўна баялася за свайго першынца — Валерку. Рос ён паслухмяным і жвавым хлопчыкам, добра вучыўся ў школе. Пасля заканчэння дзесяцігодкі нікуды паступаць, да здзіўлення многіх, не паехаў, а застаўся працаваць у мясцовым клубе загадчыкам, там якраз мелася такая вакансія. «Пакуль не вырашыў, кім хачу стаць, — апраўдваўся перад дужа цікаўнымі. — Трэба агледзецца вакол сябе». Пакуль вырашаў і аглядаўся, наспеў час ісці ў войска. Трапіў ажно на Далёкі Усход. Пісаў бацькам рэгулярна, хваліўся, што служба ў арміі падабаецца. А неяк прызнаўся, што камандзір параіў яму паступаць у вышэйшае ваеннае вучылішча. Пры гэтым падкрэсліваў: з цябе, кажа, атрымаецца добры афіцэр. Што скажаце, мае родныя?..

Дома, канешне ж, парадаваліся: афіцэр — гэта няблага, будучае ў сына будзе забяспечана. Вунь як ганарацца сваімі сынамі, якія сталі камандзірамі ў арміі, землякі!

Валерка паспяхова скончыў вучылішча, пабраўся шлюбам з прыгожай дзяўчынай, з якой пазнаёміўся на новым месцы службы. А там, як гром з яснага неба, — Афганістан... Увайшла туды і вайсковая часць, у якой служыў камандзірам узвода лейтэнант Валерка. Адтуль, да глыбокага смутку родных і блізкіх людзей, ён вярнуўся ў цынкавай дамавіне...

Пазней Марфа Мікалаеўна прызнавалася:

— Сон я бачыла... Як толькі Валерку нарадзіла... Быццам упусціла яго, маленькага, груднічка, у раку, а ён паплыў, паплыў і прапаў з вачэй. Я бягу па беразе, гукаю яго, углядаюся ў рачную роўнядзь, а яго нідзе не відаць... Так і не ўбачыла... А мне суседка, калі я ёй пра гэты сон паведала, адразу і заявіла як адрэзала, прама ў вочы: ён у цябе, дзеўка, доўга не пражыве... Я тады пакрыўдзілася была на суседку: што ты такое кажаш?! Сплюнь! Але дарэмна пакрыўдзілася: яна мне праўду, выходзіць, сказала... Балючую, нядобрую, але — праўду... Сон, на нашу бяду, збыўся... Хоць і пражыў яшчэ пасля яго наш сыночак дваццаць шэсць гадкоў...

## РОДНАЕ

У кожнага з нас ёсць прыгожая, сонечна-светлая і загадкава-таямнічая краіна, назва якой — дзяцінства. Асабліва на схіле гадоў мы туды ой як часта вяртаемся!

Рыгор Паўлавіч вырас у вёсцы. Пакінуў яе даўно — якраз у той час, калі можна было атрымаць пашпарт. Нагадаю, калі хто забыўся ці не ведае: каб затрымаць людзей у вёсцы, у сярэдзіне мінулага стагоддзя было забаронена выдаваць пашпарты сялянам, а без дакумента каму ты дзе патрэбен? Вырваўся тады з вёскі і Рыгор. Паехаў у Казахстан, дзе ўжо працавалі на шахце некаторыя ягоныя землякі. Калі наведваліся дадому, то шыкавалі надта. Частавалі землякоў у мясцовай краме гарэлкай, бралі да яе самую дарагую закуску, а асобныя нават куплялі сваякам веласіпеды: катайцеся, нам грошай не шкада, шахта яшчэ падкіне!..

Быў выпрацаваны тады своеасаблівы ланцужок: паехаў адзін хто куды-небудзь падалей ад сваёй малой радзімы, не паспееш і вокам міргнуць, як за ім услед туды ж перабіраецца яшчэ нехта, потым яшчэ... Так паступова адна частка вёскі перасялілася ў той жа Казахстан, другая атабарылася ў Карэліі, трэцяя — у Крывым Розе... Не кажучы ўжо пра райцэнтр і абласны горад.

Амаль дваццаць гадоў Рыгор Паўлавіч працаваў шахцёрам, а потым жонка перацягнула яго на сваю радзіму — у горад Орск Арэнбургскай вобласці. Там і дажывае свой век. Быццам і пенсія неблагая, і гадоў жыццё адмерыла пад дзевяноста. Што яшчэ трэба чалавеку, здавалася б. Але не дае спакою туга па вёсцы, па сваёй малой радзіме. «Туды б вярнуцца, там бы памерці...» — нярэдка думае ён, і шкадуе, што паслухаўся жонку, паддаўся: трэба было б усё ж настаяць, каб бліжэй перабірацца да сваіх родных мясцін, у Беларусь. Але як атрымалася, так атрымалася. Назад не павернеш. Позна. І ўсё ж ён у рэшце рэшт не вытрымаў, вярнуўся — хоць вокам глянуць, хоць глыток паветра свайго дзяцінства ўхапіць... Смачней за яго, відаць, няма нічога на свеце...

Прыехаў у вёску старэнькі дзядуля з унукам, бо ў такім узросце як бы ён адзін дабраўся? Толькі вёскі сваёй чалавек не знайшоў. Спазніўся. Ні хат, ні дрэў... На яе месцы было звычайнае поле. Пабываў на могілках, ледзьве адшукаў на іх крыжы, пад якімі пахаваны маці і бацька, дзяды і бабулі. Паклаў кветкі. І не змог стрымаць здрадніцкія слёзы.

— Прабачце, што даўно не прыходзіў, — шаптаў стары. — Усё адкладваў ды адкладваў... а таго і не заўважыў, як жыццё праляцела... Думаў, яно доўгае, а яно — пшык... Даруйце, мае родныя... Каб можна было, я б папрасіўся прылегчы побач з вамі... Аднак не атрымаецца, Марыя не даруе... Даў слова, калі жывая была: ні на крок ад яе...

Рыгор Паўлавіч схадзіў у суседнюю вёску, папрасіў у першай хаце, папярэдне назваўшы сябе, рыдлёўку і зноў вярнуўся на тое месца, дзе некалі стаяла пад чыстым небам і шчодра абагравалася сонейкам яго родная вёска. «Недзе тут была крыніца, — разважаў стары. — Калі хаты знесці можна, спаліць ці закапаць, то нельга ж закапаць крыніцу, спыніць яе ход з зямлі на свет Божы. А якая смачная, гаючая была тая крынічная вада! Ажно зубы нямелі... Але што нам, маладым!.. Пілі і радаваліся...»

Стары нарэшце вызначыў тое месца, дзе па ягоных згадках-меркаваннях павінна быць крыніца, і ўнук запрацаваў рыдлёўкай. Доўга ці не ён капаў, аднак свайго Рыгор Паўлавіч дамогся — крыніца ажыла!

На другі дзень яны абклалі крыніцу камянямі, а дно яе ўсыпалі маленькімі рознакаляровымі каменьчыкамі, якія неўзабаве зрабіліся чысценькімі, як і сама вада. На адзін з камянёў Рыгор Паўлавіч паставіў кубак, што браў у дарогу. «Хай тут стаіць. Мо хто захоча наталіць у спякотны дзень смагу?..Мо хто яшчэ захоча перайсці гэтае поле, як я?..»

Ён доўга, да слёз уваччу, глядзеў на крыніцу, на гэты неацэнны зямны скарб, і раптам спалохаўся, што не зможа пакінуць яе, як некалі пакінуў вёску... Вось зараз возьмуць і не паслухаюцца ногі... Нібы шукаючы падтрымкі, з трывогай глянуў на ўнука. Той моўчкі ўзяў дзеда пад локаць, і яны пайшлі.

Рыгор Паўлавіч некалькі разоў азіраўся — пакуль не прапала з вачэй крыніца. Гэтым разам — назаўсёды. Назусім...

**Васіль ТКАЧОЎ.**



Фота носіць ілюстрацыйны характар.

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

Факт

## ПАД БАРЫСАВАМ ВЫЗНАЧЫЛІ НАЙЛЕПШЫХ РАТАВАЛЬНІКАЎ

**На гэтым тыдні на базе філіяла «Інстытут перападрыхтоўкі і павышэння кваліфікацыі» Універсітэта грамадзянскай абароны Міністэрства па надзвычайных сітуацыях, што месціцца ў пасёлку Светлая Рошча, вызначалі найлепшых ратавальнікаў і начальніка дзяжурнай змены падраздзяленняў ведамства.**

Спаборніцтвы доўжыліся тры дні. Яны ўключалі 14 практычных этапаў, максімальна набліжаных да баявых дзеянняў у розных сітуацыях, і здачу тэсціравання. Ратавальнікі ліквідоўвалі надзвычайную сітуацыю тэхнагеннага паходжання, працавалі ў дыхальным апараце са сціснутым паветрам, беглі двухкіламетровы крос, шукалі людзей на акваторыі і працавалі на вышыні. А яшчэ яны мусілі залезці на вышыню па вяровачнай лесвіцы, пераадолець лабірынт, падвал, агонь...

— З гэтымі перашкодамі ратавальнікі сутыкаюцца пастаянна падчас сваёй работы, — расказалі ў МНС. — Прычым мы пастараліся ўскладніць сцэнарый. Да таго ж яны павінны пераадолець дыстанцыю не толькі максімальна якасна, але і хутка, таму што падчас баявога выезду важная кожная секунда.

Найлепшым начальнікам каравула стаў прадстаўнік Брэсцкай вобласці Аляксандр Клетаніца. Сярод ратавальнікаў не было роўных Ігару Жалткевічу, які выступаў за Віцебшчыну.

**Валяр'ян ШКЛЕННІК.**

Здарэнне

## ВЫНЕСЛІ З ЦІРА МЯДЗВЕДЗЯ

**Ідэю з мэтай зарабіць грошай па паскоранай схеме прапанаваў свайму знаёмаму 20-гадовы віцяблянін. Малады чалавек павінен быў дапамагчы прыяцелю, каб той залезе ў адну з палатак у Парку Пераможцаў.**

Выбраўшы час у раёне паўночы, як паведамляе аддзяленне інфармацыі і грамадскіх сувязяў УУС Віцебскага аблвыканкама, хлопцы вырашылі ажыццявіць задуманае. Пакуль адзін з іх стаяў на варце, другі трапіў унутр атракцыёна з пнеўматычнай зброяй, якая знаходзілася ў спецыяльных скрынях. Зладзюжка вынес іх з аб'екта, прыхапіўшы таксама галоўны прыз — вялізнага плюшавага мядзведзя. Цацку вышынёй два з паловай метры ён падарыў сваёй знаёмай. Зброю ж паспрабаваў прадаць. Але неўзабаве абодва падазраваныя ў крадзяжы былі затрыманыя супрацоўнікамі крымінальнага вышуку Чыгуначнага РАУС. Крадзены падарунак у дзяўчыны канфіскавалі, а ў дачыненні да яе прыяцеля з таварышам завялі крымінальную справу.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

Тэхналогіі

# СМАРТФОН — СПАДАРОЖНІК ДЭПРЭСІІ?

## Ці шукаюць людзі суцяшэння ў гаджэтах

**Нягледзячы на тое, што ўсе мы ўжо даўно прывыклі да карыстання смартфонамі, навукоўцы да гэтага часу не да канца вывучылі іх уплыў на наша здароўе. Але вынікі шматлікіх даследаванняў ужо даказалі наяўнасць сувязі паміж дэпрэсіяй і залежнасцю ад смартфонаў.**



Аднак да гэтага часу незразумела адно — смартфоны з'яўляюцца прычынай дэпрэсіі, ці ж наадварот — дэпрэсіўны стан прымушае людзей часцей сыходзіць у віртуальную прастору? Новае даследаванне, праведзенае навукоўцамі з амерыканскага штата Арызона, дало адназначны адказ на гэтае пытанне.

У сваёй рабоце група навукоўцаў пад кіраўніцтвам прафесара Мэцью Лап'ера сфакусіравалася менавіта на псіхалагічнай залежнасці ад смартфонаў, а не на празмерна працяглым карыстанні электроннымі прыладамі. На думку даследчыкаў, навуковых работ, якія датычацца агульнай працяглaсці выкарыстання смартфонаў, і так дастаткова. І гэта пры тым, што чалавек можа праводзіць за смартфонам шмат часу з велізарнай карысцю — напрыклад, ведучы дзелавыя перамовы ці вывучаючы нешта для сябе новае. А вось залежнасць ад смартфона вельмі небяспечная, і да яе схільны практычна ўсе маладыя людзі ва ўзросце 18—20 гадоў.

Каб высветліць, ці сапраўды смартфоны могуць выклікаць дэпрэсію ці прычынай залежнасці ад смартфона з'яўляюцца псіхалагічныя праблемы чалавека, навукоўцы правялі апытанне менавіта сярод 18, 19 і 20-гадовых маладых людзей. Ад добраахвотнікаў патрабавалася ацаніць актуальнасць сцвярджэнняў, накшталт «Я нервуюся, калі побач са мной няма смартфона» па чатырохбальнай шкале. Таксама пры дапамозе апытання даследчыкі высветлілі ступень адзіноты кожнага чалавека. Праз некалькі месяцаў добраахвотнікі адказалі на гэтыя ж пытанні паўторна.

Якімі б ні апынуліся вынікі даследавання, навукоўцы ведалі, што рабіць далей. Яны вырашылі: калі апытанне дакажа, што прычынай залежнасці ад смартфонаў з'яўляецца адзінота і дэпрэсіўны стан, яны пазбавяць людзей ад залежнасці пры дапамозе псіхатэрапіі. Калі ж выявіцца, што смартфоны самі прычына дэпрэсіі, навукоўцы змогуць палепшыць псіхалагічны стан людзей, пазбавіўшы іх ад залежнасці.

Вынікі апытання паказалі, што смартфоны самі з'яўляюцца прычынай дэпрэсіўнага стану людзей.

Калі верыць адказам добраахвотнікаў, пры адсутнасці смартфона побач, яны пачынаюць адчуваць моцны непакой. Калі ж ён побач — пачынаюць актыўна ім карыстацца і часам цалкам забываюць пра сваё жыццё. У выніку яны марнуюць час дарма, не дасягаюць сваіх жыццёвых мэт і ў цэлым перастаюць адчуваць сябе шчаслівымі.

**По статыстыцы, ад дэпрэсіі сёння пакутуе каля 300 мільёнаў чалавек па ўсім свеце.**

Як правіла, людзі пачынаюць капацца ў сваім смартфоне, калі адчуваюць стрэс. Каб пазбавіцца ад залежнасці і не пагаршаць стан свайго псіхічнага здароўя, ім неабходна выбіраць больш здаровыя метады пазбаўлення ад стрэсу. Да іх навукоўцы адносяць даволі банальныя, але на самай справе дзейсныя і прыемныя занятні — зносіны з сябрамі, спорт, медытацыю, захапленні і хобі. Шпацыр па парку, дарэчы, таксама выдатна падыдзе, таму што надае людзям адчуванне шчасця.

Прырода

# ДЫНАЗАЎРЫ МАГЛІ ПЕРАКУСІЦЬ СУЧАСНЫ АЎТАМАБІЛЬ

**Мільёны гадоў таму па нашай планеце хадзілі сотні відаў велізарных дыназаўраў, і сустрэча з любым з іх для сучаснага чалавека скончылася б немінучай смерцю. Самымі небяспечнымі старажытнымі гігантамі, несумненна, з'яўляліся крыважэрныя тыраназаўры, якія мелі самы моцны ўкус сярод усіх наземных жывёл, што існавалі на планеце.**

Вядома, што дзякуючы сваім моцным сківіцам тыраназаўр мог лёгка раскусваць тоўстыя косткі сваіх ахвяр. У фільме «Парк юрскага перыяду» 1993 года рэжысёр Стывен Спілберг нават паказаў, як велізарны дыназаўр пракусвае аўтамабіль, і нядаўна навукоўцы даказалі, што гэтыя гіганты сапраўды былі на гэта здольныя. Але як яны не ламалі сабе чэрап, пракусваючы тоўсты метал?



Рост тыраназаўра дасягаў шасці метраў.

Пра рэкордную сілу ўкусу тыраназаўра навукоўцам вядома ўжо даўно — сярод іх астанкаў часта знаходзілі сляды пераправленых костак. Даследчыкі доўга не маглі зразумець, якім чынам дыназаўры жавалі настолькі цвёрдую ежу. Справа ў тым, што доўгія гады палеантолагі лічылі чэрап тыраназаўра гнуткім, нібы ў птушак і змей, у якіх яго часткі могуць рухацца ў розныя бакі. Гэтая асаблівасць дапамагае буйным змеям цалкам праглынаць нават людзей, але тыраназаўру гнуткая будова чэрапа была непатрэбная. А вось цвёрды чэрап без рухомых частак, як у кракадзілаў, быў бы ім вельмі дарэчы — па-іншаму дзіўную здольнасць тыраназаўра пракусваць косткі не растлумачыць.

Наколькі моцна кусалі тыраназаўры? У розных крыніцах сіла ўкусу гэтага яшчара паказваецца па-рознаму. У большасці гаворыцца, што яна раўняецца 34 000 ньютанаў. Хутчэй за ўсё, гэты паказчык не адпавядае рэчаіснасці, таму што ў новым даследаванні навукоўцы пад кіраўніцтвам прафесара Яна Коста ўзялі за аснову павялічаную ў два разы сілу, роўную, адпаведна, 64 000 ньютанаў. Гэта значыць, што на косткі ахвяр дзейнічала сіла, эквівалентная 7,1 тоны.

Каб праверыць, ці сапраўды тыраназаўры мелі цвёрды чэрап, навукоўцы аднавілі яго ў выглядзе камп'ютарнай мадэлі. На галаву даўжынёй 1,8 метра і вышынёй 1,2 метра спачатку былі накладзеныя гнуткія суставы, як у птушак і рэптылій. Вывучыўшы атрыманую канструкцыю, навукоўцы прыйшлі да высновы, што чэрап са шматлікай колькасцю рухомых частак не дазволіў бы тыраназаўру пракусваць косткі сваіх ахвяр — пры вышэйзгаданай сіле ўкусу ён папросту не вытрымаў бы такой нагрузкі.



Трохмерная мадэль чэрапа тыраназаўра.

Затое пры адсутнасці рухомых частак тыраназаўры цалкам маглі з апетытам перакусваць нават самыя тоўстыя косткі. Пра аўтамабіль з фільма «Парк юрскага перыяду» і казаць няма чаго, таму што вялізны дыназаўр лёгка б з ім справіўся. Яму маглі перашкодзіць хіба што шкло, вострый метал і бензін, але факт застаецца фактам — тыраназаўр мог лёгка пракусіць кузаў аўтамабіля.

Навукоўцы нястомна займаюцца вывучэннем тыраназаўраў і кожны раз адкрываюць нешта новае. Напрыклад, у навуковым асяроддзі сёння вельмі папулярная здагадка, што яны былі пакрытыя пер'ем, — мастакі нават намалявалі, як выглядалі тыраназаўры, калі гэтая тэорыя сапраўды праўдзівая. А здагадка сапраўды можа быць слушная, таму што сведчанняў сваяцтва дыназаўраў з сучаснымі птушкамі сёння вельмі шмат.

**Падрыхтаваў Іван КУПАРВАС.**

Цёмнае мінулае

# БАГАЦЕЙ ПАСЛЯ СМЕРЦІ

## Гэты рытуал дапамагаў старажытным егіпцянам быць падобнымі на багачоў

**Ва ўсе часы людзі імкнуліся да багацця або хацелі быць падобнымі на вельмі заможных людзей. Напрыклад, каб выглядаць паспяхова, некаторыя сёння гатовыя ўзяць буйны і цяжкі для свайго бюджэту крэдыт на дарагі аўтамабіль.**



Як правіла, фараонаў хавалі ў дарагіх саркафагах.

Мяркуючы па археалагічных знаходках, выглядаць багатымі жадалі нават старажытныя егіпцяне, прычым не толькі пры жыцці, але і пасля смерці. Іх спосаб паказаць сваю ўяўную заможнасць быў вельмі дзіўны і нават жудасны: на тэрыторыі егіпецкага паселішча пад назвай Сакара археолагам удалося знайсці муміі даволі бедных людзей, якія былі пахаваныя настолькі «багата», наколькі дазваляла фантазія далакопаў.

Дзіўнае пахаванне было знойдзена польскімі археолагамі ў верасні 2018 года непадалёк ад піраміды Джосера, якая лічыцца самай старой у свеце. У 2000-гадовых магілах ляжалі дрэнна захаваныя целы людзей, якія былі падвергнутыя толькі асноўным працэдурам бальзаміравання. Труны былі закапаныя проста ў выкапаных у пяску ямах. На момант раскопак магіл месца пахавання ўжо было разрабавана, але археолагі знайшлі сляды ўпрыгажэння — далакопы відавочна хацелі, каб пахаванне простых рабочых выглядала амаль як у фараонаў.

Практычна ўсе дэталі пахавання сведчаць пра тое, што далакопы, якія хавалі людзей, былі непісьменныя. На вечку адной труны былі намаляваны каралі, а ніжэй павінен быў размяшчацца надпіс з іменем пахаванага чалавека. Але, як археолагі ні імкнуліся расшыфраваць іерогліфы, ім гэта не ўдалося. Рэч у тым, што непісьменны магільшчык проста маляваў бессэнсоўныя сімвалы, быццам спрабуючы намаляваць калісьці ўбачаныя ім іерогліфы.

Таксама на труну была нанесена выява захавальніка іншасвету Анубіса. Аднак, яго цела было намалявана сінімі фарбамі, у той час як звычайна яно малявалася чорным колерам. Даследчыкі выказалі здагадку, што магільшчык папросту не быў знаёмы з мастацкімі традыцыямі. Аднак таксама ёсць імавернасць, што магільшчык хацеў зрабіць дасылку да боскіх валасоў з каштоўнасцяў сіняга колеру.

Гэтае незвычайнае пахаванне раскрыла вельмі цікавую дэталь з жыцця старажытных егіпцян. Атрымліваецца, што ў сучасных людзей і продкаў, што жылі тысячы гадоў таму, ёсць шмат агульнага. Жаданне хоць трохі паходзіць на багатых людзей — выдатны таму доказ. Вось прызнайцеся шчыра, вы ж напэўна ведаеце людзей, якія выдаткуюць плойму грошай на не самыя неабходныя ў жыцці рэчы накшталт упрыгажэнняў ці модных гаджэтаў, каб быць хоць трохі падобнымі на багатага чалавека?

Характэрна, што пра цікавыя дэталі з жыцця старажытных людзей археолагі даведваюцца вельмі часта. Напрыклад, у 2018 годзе даследчыкам удалося раскапаць рэшткі незвычайнага скандынаўскага дома, у якім захоўваліся рэшткі памерлых вікінгаў. Навукоўцы да гэтага часу паняцця не маюць, для чаго была патрэбна гэтая грабніца. Магчыма, у ёй захоўваліся целы памерлых у халодную пару года воінаў — вясной іх можна было дастаць і пахаваць згодна з усімі паганскімі традыцыямі. Таксама магчыма, што забабонныя скандынавы папросту замыкалі мёртвых людзей у дамах, каб іх душы не трывожылі жывых.



Мумія невядомага егіпцяніна.

# «БЛІЗКІЯ ПРЫВЫКЛІ, ШТО Я НЯСУ ІНШАПЛАНЕТНЫЯ РЭЧЫ»

## Сапраўдны, шчыры і прамалінейны. Андрэй Арамнаў расказвае пра сваё вяртанне на п'едэстал

**Мы сустракаемся з Андрэем у Рэспубліканскім цэнтры алімпійскай падрыхтоўкі «Стайкі» — цяпер менавіта тут ён праводзіць больш за ўсё часу. Пасля чэмпіянату свету Андрэй ужо раздаў некалькі інтэрв'ю, ды і за сваю насычаную рознымі падзеямі спартыўную кар'еру цяжкаатлет прывык да частых візітаў журналістаў, таму пагаджаецца на размову адразу, без узгаднення тэм і пытанняў. Шпацыруючы па тэрыторыі спарткомплексу, назіраем, як да Андрэя раз-пораз падыходзяць людзі — работнікі сталоўкі, трэнеры па іншых відах спорту, мясцовыя рыбакі. Яны віншуюць Арамнава з перамогай, хоць на чэмпіянаце свету, нагадаем, ён стаў другім, жадаюць спартсмену поспехаў і кажуць, што будуць хварэць за яго далей. Андрэй дзякуе мінакам, кагосьці цёпла абдымае, камусьці паціскае руку. Мімаволі ўзнікае пытанне: ці той гэта Арамнаў, што ўвесь час выказвае правакацыйныя рэчы і дзівачыць у інтэрнэце? А той, звяртаючыся да нас, пачынае апавядаць пра тое, што на тэрыторыі «Стаек» ёсць выдатнае возера, каля якога ён з вудай праводзіць свае выхадныя. Трапляецца ў асноўным карась, ёсць і карп, рыба вельмі смачная, таму што возера чыстае. Асноўную частку ўлову Андрэй дорыць знаёмым, штосьці сушыць для сябе. «Тут можна адысці ад спаборніцтваў, абстрагавацца, што важна ў сур'ёзных відах спорту. Інакш можа падарваць каўпак», — лічыць спартсмен.**



Фота Ганны ЗАНКАВІЧ.

Пасля Пекіна-2008, калі Арамнаў у 20-гадовым узросце стаў алімпійскім чэмпіёнам, яго біяграфія стала падобная на амерыканскія горкі. Спартсмена затрымлівалі падчас кіравання аўтамабілем у стане ап'янення, пазбаўлялі правоў, прыцягвалі да крымінальнай адказнасці за паўторныя парушэнні, а ён адно за адным даваў скандальныя інтэрв'ю. Сыходзіў з вялікага спорту і вяртаўся. Атрымаў цяжкую траўму і, здавалася б, «завязаў» з цяжкай атлетыкай назаўжды, але раптам праз тры гады вярнуўся. Ды як! Спачатку стаў сярэбраным прызёрам чэмпіянату Еўропы, а потым узяў «серабро» чэмпіянату свету, пасля чаго заявіў, што мае намер паехаць на Алімпіяду ў Токіа.

### «У нармальнага цяжкаатлета сапернік адзін — штанга»

**— Пачнём з чэмпіянату свету. Ці задаволены вы сваім выступленнем і вагамі, якія там паднялі?**

— Атрымалася ўсё, што запланавана, нават трохі больш. Апошні мой сусветны рэкорд быў вельмі даўно — не чакаў, што ўстанавіць чарговы атрымаецца цяпер, але мой характар спрацаваў у патрэбным кірунку.

**— Магчыма, гэты чэмпіянат свету паказаў, над чым яшчэ трэба папрацаваць у перадалімпійскі год?**

— Ёсць адзін момант. Перад гэтым стартам я шмат важыў, даходзіў да 122 кг, таму давялося экстранна сушыцца, зганяць вагу. Гэта мела наступствы: былі моманты, калі стомленасць перамагала, нават узнікала галавакружэнне. Я працаваў на максімуме, што не вельмі добра ў маім узросце. Хочацца, каб усё адбывалася спакайней.



Чэмпіянат свету 2018 года быў усяго праз некалькі месяцаў пасля таго, як я вярнуўся ў каманду, у цяжкую атлетыку. Да чэмпіянату Еўропы ўдалося падрыхтавацца ўжо лепш, таму што ў складзе нацыянальнай каманды ўсё ж такі рыхтавацца зручней, чым дома. Я заяўляю, што хачу стаць двухразовым алімпійскім чэмпіёнам. Гэтая Алімпіяда, хутчэй за ўсё, будзе для мяне апошняя, таму яна цяпер — галоўнае для мяне.

**— Ці цяжка ўтрымаць пік формы ў 31 год?**

— Складана атрымаць новы вынік, прасцей вярнуць стары. Цяпер цяжэй псіхалагічна, таму што вялікая адказнасць ляжа на таго чалавека, хто паедзе на Алімпійскія гульні, трэба будзе спрацаваць на 100 %. Ёсць перажыванні: раптам штосьці не атрымаецца. Значыць, трэба рыхтавацца з добрым запасам, каб гэтыя думкі не перашкаджалі падымаць штангу.

**— У сувязі з тым, што алімпійскіх ліцэнзій у нашай каманды мінімум, у калектыве напружаная абстаноўка?**

— Магчыма, у трэнерскім штабе гэтыя моманты адчуваюцца. У нармальнага цяжкаатлета сапернік адзін — штанга. Хто больш падымае, той і едзе на спаборніцтвы. Я заўсёды раіў маладым спартсменам не займацца глупствам, не спрабаваць біцца адзін з адным, а лепш падымаць вынік, ад якога ўсё гэта залежыць. Ніякіх закулісных гульняў быць не павінна, але да Алімпіяды яшчэ далёка, рана казаць, хто куды едзе, — можа быць, такія гульні і пачнуцца, хоць не хацелася б. Цяпер у нас вельмі маладая зборная, самая галоўная задача мая і трэнераў — стварыць новую каманду, якая на Алімпіядзе ў Парыжы выступіць грунтоўна. Магчыма, і я буду ў складзе той каманды. Трэба быць загадзя гатовым.

### «Я ведаю, мне дапамагае Бог»

**— Калі вы прынялі рашэнне вярнуцца ў вялікі спорт, ужо тады вашай мэтай быў Токіа, альбо толькі цяпер, калі ўсё зноў стала атрымлівацца?**

— Я атрымаў вельмі сур'ёзную траўму, пасля якой не мог думаць пра далейшы спорт, пачаў займацца блогінгам, праяўляць сябе ў сацсетках. Так атрымалася, што паказваў практыкаванні і адчуў, што нага перастала балець. У мяне з'явілася іскрынка надзеі, што, калі я зноў пачну займацца, што-небудзь можа атрымацца. З кожным днём і з кожным месяцам прыходзіла больш упэўненасці, і, калі вынік пачаў быць падобны на сусветны, нага наогул перастала турбаваць. Я ведаю, хто я такі, ведаю сваю сілу, сваю псіхіку, я ведаю, што мне дапамагае Бог, таму вырашыў біцца да канца.

**— З якой рэакцыяй сустрэліся, калі аб'явілі пра сваё вяртанне?**

— Мала хто верыў, усё ж такі я заўсёды кажу вельмі шмат усяго. Родныя і блізкія прывыклі да таго, што я нясу іншапланетныя рэчы. Ніхто не ведае, што ў мяне ў галаве, але я ўсё даказаў вынікам.

**— Дапусцім, што вы трапляеце ў Токіа. Якая Алімпіяда для вас будзе прасцейшай, першая ці цяперашняя?**

— Кожныя спаборніцтвы складваюцца па-рознаму. На цяперашні момант гэты чэмпіянат для мяне быў самым цяжкім з усіх спаборніцтваў. Я меў вельмі моцнага саперніка — Сімона Марцірасяна. Ён малады, перспектыўны. Гэта будзе вельмі цікавая бітва. Калі ўсё складзецца, як павінна быць, Алімпіяда Пекіна і побач не стаяла з тым, што будзе адбывацца ў Токіа.

**— Тое, што вы сталі алімпійскім чэмпіёнам у 20 гадоў, — плюс ці мінус?**

— У 20 гадоў я атрымаў фінансы, у мяне змянілася жыццё. Тым больш да таго часу я яшчэ не паспеў ні нагуляцца, ні пазаймацца глупствам, хацелася ўсё паспрабаваць, рабіць розныя кшталту эксперыменты. Добра, што цяпер я ўжо трошачкі пасталеў і супакоіўся, многія рэчы мяне ўжо не цікавяць. У маладосці паспрабаваў усё, што трэба было паспрабаваць у маладосці, а цяпер вяду сябе прасцей.

### «Па жыцці я бізнесмен, толькі грошай няма»

**— На некалькі гадоў вы адышлі ад спорту. Чым тады займаліся, як жылі?**

— Я сышоў дзесьці ў канцы 2014 года, у пачатку 2017-га вярнуўся ў зборную. Увесь гэты час займаўся педагагічнай дзейнасцю і ўсялякім глупствам — чым я толькі не займаўся! Мне пашанцавала, што я змог вярнуцца, тым больш так добра вярнуцца. Многія глядзяць на гэта з зайздрасцю, таму што ў некаторых не атрымліваецца зрабіць адну добрую кар'еру цяжкаатлета, а ў мяне выгарае ўжо другая. Мала хто разумее, што гэта не толькі шанцаванне, але і як мінімум Божая падтрымка. Мяне любіць сусвет, і я люблю яго.

Вядома, калі больш за паўжыцця прысвячаеш спорту і ў цябе забіраюць гэтую велізарную частку, яе няма чым запоўніць, ты ў пастаянных пошуках, прыходзяць і добрыя, і дрэнныя думкі. Калі прыходзяць дрэнныя, можна зламацца, у мяне было шмат такіх момантаў. Былі праблемы з законам, я працягнуў ездзіць выпіўшы за рулём, у мяне потым канфіскавалі машыну, я трапіў пад дамашні арышт, потым пачаліся праблемы з праверкамі пад дамашнім арыштам, мяне хацелі пасадзіць у турму. Чаго толькі не адбывалася, але ў выніку я вытрымаў, мне дапамог спартыўны характар. Мала хто выкараскваецца адтуль, адкуль выкараскаўся я. Вядома, тут праблема нашага спорту — у тым, што спартсменам, якія сыходзяць, ніяк не дапамагаюць. Пасля перамогі на Алімпіядзе табе трэба зноў стартаваць з нуля. Першы год пасля сыходу я працаваў за 50 долараў у спартшколе трэнерам. Добра, што нічога не прадаў, захаваў кватэру. Упэўнены, мяне зноў гэта чакае. Мінулым разам ад таго, што атрымаў траўму і не быў гатовы да такога (а да траўмы быў настолькі перагружаны трэніроўкамі і рэжымам, што проста маральна не вытрымліваў), з'яўляліся бяссонніца і паўвар'яцкі стан. Цяпер здаецца: з аднаго боку, добра, што адпачыў, з другога — магло б і не пашанцаваць выбрацца адтуль.

**— Ці ёсць учынак, пра які вы шкадуеце?**

— Заўсёды яны ёсць. У мяне цяпер усё добра, таму я з упэўненасцю мог бы сказаць, што гэта была выдатная школа. З другога боку, ці трэба было мне ўсё гэта пераносіць? І псіхалагічна складана было, і ў сям'і праблемы ўзнікалі: яна магла разбурыцца. Шкадую, што не змог выступіць на ўсіх Алімпіядах, таму што не быў дастаткова дасведчаны, каб думаць у перспектыве. Уступаў у канфлікты з трэнерамі, хоць іх нельга было пазбегнуць, трэнеры хацелі прыціснуць мяне да пазногця, а з маім характарам гэта немагчыма. Усе памыляюцца. Цяпер бы я рыхтаваўся на чацвёртую Алімпіяду, і было б выдатна.

**— Толькі адсутнасць грошай тады прымусіла вас пайсці на трэнерскую работу?**

— Я не збіраў фінансы, каб «замуціць» бізнес, а калі ў мяне канфіскавалі машыну, тым больш не было сродкаў. Па жыцці я бізнесмен, толькі грошай няма, заўсёды пакідаю іх на потым, а потым яны трацяцца. Раней у мяне быў выраз — «горш быць не можа», а цяпер я дакладна ведаю, што ў любы момант можа быць яшчэ горш, як бы ні здавалася, што ўсё прапала. Цяпер я ведаю, што прыйдуць прызавыя за чэмпіянат свету і Еўропы, за сусветныя рэкорды, спецыяльна выкінуў картку, каб выпадкова іх не выдаткаваць. Мы чакаем папаўнення ў сям'і, таму замест кватэры хацелася б пабудаваць вялікі дом.

Работа з дзецьмі — гэта добры, цікавы вопыт, наогул я адчуваю, што ў мяне атрымліваецца трэніраваць. Цяпер няма магчымасці займацца дзецьмі, я працую з дарослымі, проста стаўлю добрую базу, каб людзі разумелі, што такое цяжкая атлетыка. На мой погляд, у свеце мала правільнай дакладнай педагогікі ў цяжкай атлетыцы, савецкая школа грунтавалася на медыкаментах і здаровых хлопцах, цяпер прыйшла эпоха Арамнава, дзе важная тонкая тэхніка. Трэнірую анлайн, але займацца ў мяне стала задорага.

**— Ці задавальняе цяпер ваш заробак?**

— Канешне не. Заўсёды хочацца атрымліваць больш, таму што шмат фінансаў сыходзіць на падрыхтоўку. Чым даражэйшы аўтамабіль, тым даражэйшае яго абслугоўванне, чым далей я ўпіраюся ў вынік, тым усё больш сродкаў трэба на падтрыманне формы.

**«У 20 гадоў я атрымаў фінансы, у мяне змянілася жыццё. Тым больш да таго часу я яшчэ не паспеў ні нагуляцца, ні пазаймацца глупствам, хацелася ўсё паспрабаваць».**

**— Журналісты любяць вас за адкрытасць. Калісьці даводзілася пакутаваць пасля сказаных слоў?**

— Шмат разоў. Часта журналісты інтэрпрэтавалі мае словы не так, у тым ліку праз гэта мая кар'ера не здавалася такой ужо добрай. Трапляла і трэнерам, і камандзе, і маім родным. Я за гэта вельмі прашу прабачэння. Пасля кожнага інтэрв'ю мне кажуць: «Андрэй, можа, не трэба наогул даваць інтэрв'ю?» Але я не магу, таму што мая медыйнасць у тым ліку дапамагла мне вярнуцца. Было шмат абраз, але той вынік, які ў мяне атрымаўся, — аплявуха тым, хто мяне абразіў.

**— Здаецца, менавіта дзякуючы гэтай шчырасці і адкрытасці вас і любяць балельшчыкі.**

— Так, я сфарміраваўся ва ўяўленні многіх людзей як абсалютна сумленны і адкрыты чалавек, праз гэта ў маім жыцці з'явіліся добрыя людзі, якія дапамагалі, падтрымлівалі. Перамога і маё вяртанне — па большай частцы ёсць гэтыя людзі, а не мая працавітасць або тэхніка. Бывала, засыпалі мяне грашыма, толькі каб я не здаваўся і вярнуўся. Тысячаразова ўдзячны тым, хто дапамагаў не толькі фінансава, але і псіхалагічна.

**— Што б вы параілі сёння сабе маладому і кожнаму юнаму спартсмену?**

— Сабе — ніколі не здавацца. А маладым спартсменам — паспрабаваць адчуць свой спорт, сваю тэхніку. Я як педагог сутыкнуўся з тым, што ў педагогіцы шмат няправільнага. Многія становяцца педагогамі ад безвыходнасці. Я параіў бы спартсменам навучыцца ўсё рабіць самім, тады і пра свае памылкі не шкадуеш. Вядома, трэба прыслухоўвацца да трэнера, але зрабіць свае высновы. І абавязкова вывучаць навуку, таму што спорт без медыцыны і навукі сёння — не спорт.

**Дар'я ЛАБАЖЭВІЧ.**

*Мінск — Стайкі — Мінск.*

## ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНЫХ ТОРГОВ

| | |
|---|---|
| **Организатор аукциона** | ООО «Юридическая группа «ПАРТНЕР», тел. +375 44 719 44 14 |
| **Продавец** | ООО «СИДКОМ», г. Смолевичи, ул. Торговая, д.14а, тел. + 375 44 719 44 14 |

**Предмет аукциона**

